

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 МАЯ 2014 г. СУБОТА № 85 (27695) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# МЫ — НАШЧАДКІ ВЯЛІКАГА НАРОДА-ПЕРАМОЖЦЫ

## УСВЕДАМЛЕННЕ ГЭТАГА — КРЫНІЦА НАШАЙ СІЛЫ І ЎПЭЎНЕНАСЦІ

**Свята Перамогі ў Беларусі нельга ўявіць без урачыстага шэсця па галоўным праспекце сталіцы. Мірныя жыхары мірнай краіны пад мірным небам крочаць па мірным прыгожым горадзе. Найлепшы сімвал Вялікай Перамогі, які з гадамі не страчвае актуальнасці і сучаснасці.**

**Шэсце пачалося ад вуліцы Янкі Купалы і прайшло па праспекце Незалежнасці да плошчы Перамогі. Калону ўзначаліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У некалькіх адкрытых аўтамабілях ехалі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, частка ветэранаў ішла ў радах.**

**У шэсці прынялі ўдзел вышэйшыя службовыя асобы, прадстаўнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў, дыпламатычнага корпуса, моладзь.**

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў памяць аб подзвігу народа ў Вялікую Айчынную вайну ўсклаў вянок да манумента Перамогі. Да падножжа манумента ляглі таксама кветкі і вянкі ад вышэйшых службовых асоб, кіраўнікоў дзяржорганаў, прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, ветэранаў, духавенства, дыпламатычнага корпуса і Выканкама СНД.**



Фота БЕЛТА.







Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі на цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі 9 мая 2014 года

Дарагія ветэраны!

Паважаныя суайчыннікі і замежныя госці!

Сардэчна віншую вас з адным з самых шануемых на беларускай зямлі свят — Днём Перамогі. Для мільёнаў людзей ён стаў вечным сведчаннем доблесці народаў, якія адолелі найвялікшае сусветнае зло — фашызм.

Шэсцьдзесят дзевяць гадоў аддзяляюць нас ад той вясны. Але памяць аб Вялікай Айчыннай вайне не згасае. Яна жыве ў кожным горадзе і вёсцы, передаецца з пакалення ў пакаленне, пераходзіць ад сэрца да сэрца, звязваючы ўсіх нас разам жывой ніццю любові да Айчыны.

Лёс чалавецтва ў тыя суровыя гады вырашаўся на тэрыторыі Расіі, Беларусі і Украіны. Менавіта на савецка-германскім фронце вермахт страціў свае ўзброеныя сілы і сваю праславутую зброю.

Замахнуўшыся на граніцы Савецкага Саюза, фашысты сустрэлі вельмі жорсткае супраціўленне і атрымалі рашучы адпор. Усе ад малога да вялікага паўсталі на абарону сваёй Радзімы. Ніхто і нідзе ў свеце так самааддана не змагаўся з «карычневай чумой».

Менавіта тут, на палітай крывёю савецкіх людзей зямлі, разгарнуўся галоўны фронт.

На акупіраваных беларускіх, расійскіх, украінскіх землях з першых дзён вайны быў адкрыты і сапраўдны «другі фронт». Супраць фашыстаў узнялося больш за мільён партызан — вялікая народная армія, дзеянні якой набылі стратэгічнае значэнне і сталі важным фактарам разгрому ворага.

У Савецкай краіне ў вельмі цяжкіх умовах намаганнямі простых працаўнікоў тылу была дасягнута эканамічная перавага над агрэсарам. За гады вайны выпушчана ў два разы больш баявой тэхнікі і ўзбраенняў, чым у самой гітлераўскай Германіі.

Але галоўнай перавагай СССР у барацьбе супраць магутнай і разбуральнай ваеннай машыны «трэцяга рэйха» стала духоўная стойкасць нашага народа.

Ненармальнай, чалавеканенавісніцкай ідэалогіі нацызму Савецкі Саюз проціпаставіў ідэалогію гуманізму і інтэрнацыяналізму. Плячо ў плячо больш за 100 нацый і народнасцяў СССР паўсталі на абарону агульнай Айчыны. Вялікая Перамога дасталася нашай рэспубліцы страшнай цаной — мы страцілі, скалечылі кожнага трэцяга жыхара нашай Радзімы.

Савецкая Беларусь унесла неацэнны ўклад у разгром ворага. Яна стала рэспублікай-партызанкай. У строй народных мсціўцаў усталі каля паўмільёна чалавек. Восемдзесят восем з іх удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

Гераічнае супраціўленне народа фашызму, якое пачалося ў Брэсцкай крэпасці, у баях пад Гродна, Мінскам, Полацкам, Лепелем, Віцебскам, Барысавам, Магілёвам і Гомелем, прадаўжалася да поўнага выгнання акупантаў.

Вечная слава загінулым у баях і ад зверстваў фашыстаў. Удзячная Беларусь помніць вас і шануе ваш подзвіг. Мы зробім усё, каб ваша вялікая ахвяра на алтар Айчыны не аказалася дарэмнай. Страшэнны агонь вайны, разбурэнняў і смерці больш ніколі не павінен успыхнуць на беларускай зямлі.

Прапаную ўшанаваць памяць усіх герояў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны мінутай маўчання.

*(Мінута маўчання).*

Дарагія сябры!

Цяперашні, 2014 год адзначаны дзвюма знакавымі падзеямі ў гісторыі. У ліпені споўніцца 70 гадоў з дня вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а ў жніўні — 100 гадоў з дня пачатку Першай сусветнай вайны.

Гэтыя памятныя даты — падстава для сур'ёзных разважанняў. Чаму ўсяго праз тры дзесяцігоддзі пасля Першай сусветнай вайны разгарэўся новы ўсепланетарны пажар? Як магла ў цывілізаванай Еўропе зарадзіцца і набраць сілу пячорная ідэалогія нацызму? Ці хопіць у сучаснай палітычнай эліты розуму і сумлення, каб не правакаваць новыя разбуральныя канфлікты?

На жаль, сёння некаторыя палітыкі аддаюць забыццю ўрокі гісторыі, спрабуюць прынізіць ролю савецкага народа ў Перамозе над фашызмам, патураюць адраджэнню нацызму.

Каб дагадзіць палітычным і геастратэгічным амбіцыям, ажыццяўляецца мэтанакіраваная дзейнасць па дэстабілізацыі палітычнай абстаноўкі ў суверэнных дзяржавах. Такія прыклады мы назіраем на Блізкім Усходзе, у Паўночнай Афрыцы, іншых «гарачых кропках» планеты.

Балюча гаварыць аб тым, што адной з такіх «гарачых кропак» стала блізкая нам наша Украіна. Над брацкай славянскай краінай навіслі хмары грамадзянскай вайны, і брат падняў руку на брата. Чаго б нам гэта ні каштавала, мы павінны гэта спыніць.

Нас непакоіць і той факт, што гэтыя падзеі выкарыстоўваюцца як падстава для актывізацыі дзяржавамі НАТА ваеннай дзейнасці непасрэдна каля нашых беларускіх граніц. Усё гэта патрабуе асаблівай пільнасці і з'яднанасці народа.

Мы атрымалі бясцэнныя ўрокі з трагічных падзей XX стагоддзя. Мы ведаем цану міру і згоды і будзем няўхільна адстойваць свае ідэалы.

Нашы Узброеныя Сілы гатовы ў любую мінуту адстаяць суверэнітэт Беларусі, грамадзянскі мір і згоду ад замахаў звонку і знутры.

Справа гонару кожнага грамадзяніна — абарона Айчыны і штодзённы клопат аб яе ўмацаванні!

Паважаныя ветэраны!

Перамога ў маі 45-га — гэта ваш найвялікшы ўклад у ратаванне і развіццё чалавечай цывілізацыі, у нашу з вамі агульную мірную сучаснасць і ў будучыню.

Ваша пакаленне выратавала краіну, адрадзіла яе, узняўшы з попелу і руін. Стварыла моцную прамысловасць, развітую сельскую гаспадарку, перадавую навуку і багатую культуру.

Вы ўмелі ісці наперад і падтрымліваць адзін аднаго, пераадольваючы ўсе цяжкасці. Не гналіся за асабістым дабрабытам і дастаткам. Думалі спачатку аб Радзіме, а потым аб сабе. Ваша духоўная спадчына заўсёды будзе для нас бясцэннай маральнай апорай.

Дарагія суайчыннікі!

Мы — наследнікі вялікага народа-пераможцы, якому Еўропа абавязана свабодай і працвітаннем. І ўсведамленне гэтага служыць крыніцай нашай сілы і ўпэўненасці ў сабе.

У гэты святочны дзень хачу пажадаць усім вам, вашым родным, вашым блізкім здароўя, поспехаў, шчасця і дабрабыту.

Са святам вас, дарагія сябры!

З Днём Перамогі!

СТАР. 2

IIHF 2014 WORLD CHAMPIONSHIP BELARUS Minsk

# СЦЯГІ ЛУНАЮЦЬ НАД СТАЛІЦАЙ

**Першым хакейным баталіям у Мінску папярэднічала адметная святочная цырымонія. На плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь урачыста ўзнялі сцягі краін — удзельніц чэмпіянату свету па хакеі.**

— У Беларусі любяць спорт. Для многіх грамадзян, асабліва для моладзі, ён стаў нормай жыцця, — звярнуўся да прысутных на плошчы **Міхаіл Мясніковіч, прэм'ер-міністр Беларусі.** — У нас папулярны хакей. Створаны ўсе ўмовы для заняткаў фізічнай культурай і спортам, пабудаваны сучасныя спартыўныя аб'екты. Сукупнасць гэтых фактараў дазволіла спартыўнай грамадскасці, прэзідэнту Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Аляксандру Лукашэнку ініцыяваць правядзенне чэмпіянату свету па хакеі ў сталіцы Беларусі. Мы ўдзячны Міжнароднай федэрацыі хакея, якая даверыла Беларусі чэмпіянат свету. Для нас гэта вялікі гонар і адказнасць.

У сваю чаргу **Рэнэ Фазэль, прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі хакея,** у размове з журналістамі прызнаўся, што яшчэ не чуў ад удзельнікаў заўваг наконт арганізацыі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



— Мы ўжо размаўлялі з дэлегацыямі — усе засталіся задаволены прыездам. Мы сапраўды чакаем добры чэмпіянат. У Беларусі для гэтага створана цудоўная інфраструктура.

Некалькі кампліментаў сталічным лядовым стадыёнам зрабіў і легендарны савецкі варатар, трохразовы алімпійскі чэмпіён **Уладзіслаў Траццяк,** які цяпер узначальвае Федэрацыю хакея Расіі.

— У Мінску выдатныя арэны. Я наведваў амаль усе чэмпіянаты свету і лічу, што беларускія пляцоўкі выглядаюць на іх фоне дастойна. Мы ўсе падтрымалі ідэю правесці чэмпіянат у вашай краіне. Ведаў, што тут любяць хакей і зробяць адзін з самых лепшых чэмпіянатаў свету. Вы нават надвор'е добрае да прыезду гасцей зрабілі, — пажартаваў Уладзіслаў Аляксандравіч. — Спадзяюся, удзельнікі парадуюць вас добрым хакеем.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

ISSN 1990 - 763X

14085

9 771990 763008

■ На шляху да перамогі

# БЕЛАРУСЬ У ФІНАЛЕ «ЕЎРАБАЧАННЯ»!

**«Join Us!» — «Далучайцеся да нас!». Пад гэтым заклікам сёння ў Даніі фінішуе 59-ы міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2014». У фінальным шоу выступяць прадстаўнікі 26 краін — па 10 лідараў з кожнага паўфіналу, а таксама артысты «вялікай пяцёркі» краін-заснавальніц конкурсу (Вялікабрытаніі, Германіі, Іспаніі, Італіі, Францыі) і канкурсант з Даніі.**

Музычнае спаборніцтва абяцае быць надзвычай напружаным: у фінале сустрэнуцца абодва запісныя фаварыты конкурсу — Арменія і Венгрыя (паводле ставак букмекераў і меркавання фанклубаў), вялікі скандынаўскі блок — Фінляндыя, Швецыя, Ісландыя, Нарвегія і Данія, а таксама блок постсавецкіх краін — Расія, Украіна, Арменія, Азербайджан...

Але, бадай, найперш важна і прыемна для беларускіх гледачоў тое, што мы зноў пачуем свайго канкурсанта Тэа — ужо ў фінале. Насуперак прадказанням шматлікіх скептыкаў ад шоу-бізнесу, лёгкай, пазітыўнай і іранічнай песні «Cheesecake» пашанцавала куды больш, чым некалі маштабным і дарагім нумарам з пераапрананнямі, складанымі пастаноўкамі і дэкарацыямі. З чым як Юрыя Вашчука, так і ўсю беларускую каманду шчыра віншуем і сціскаем кулакі на далейшую ўдачу!



Фота БЕЛТА.

Для Беларусі сёлетняе «Еўрабачанне» — ужо 11-е, а вось праход праз сіта паўфіналаў — усяго 4-ы (раней гэта ўдавалася зрабіць Дзіме Калдуну ў 2007-м, гурту «3+2» у 2010-м і Алене Ланской у 2013-м). «Усім дзякуй за падтрымку і за галасы! — лаканічна напісаў спявак у сваім профілі ў сацсетках літаральна праз некалькі хвілін пасля абвяшчэння вынікаў. А пазней іншыя ўдзельнікі дэлегацыі прызналіся, што іх літаральна засыпалі віншавальнымі званкамі і СМС-камі са словамі падтрымкі, захаплення, падбадзёрвання і пажадання поспеху. Сацыяльныя сеткі таксама выбухнулі радаснымі эмоцыямі. Найвялікшыя аптымісты ўжо намякаюць, што да прыёму «Еўрабачання-2015» у Беларусі ўсё, уключаючы інфраструктуру, гатова. Букмекерскія канторы тым часам лічаць найбольш верагоднай перамогу Аўстрыі (!), Швецыі або Нідэрландаў, а Беларусі прагназуюць месца ў лепшым выпадку ў сярэдзіне табліцы.

Якое месца зойме Беларусь у фінале «Еўрабачання»? Верым і спадзяёмся, як мага больш высокае. На жаль, паводле правілаў, паўплываць на гэты вынік беларускія тэлегледачы не ў сілах. Затое можна галасаваць сёння за іншых упадабаных канкурсантаў — праўда, не больш чым 20 званкоў ці СМС з аднаго нумара. А хто і як галасаваў у паўфіналах, даведаемся ўжо зусім хутка: неўзабаве пасля фіналу арганізатары абяцаюць апублікаваць усе ацэнкі кожнага члена журы, а таксама вынікі галасавання кожнай краіны — удзельніцы конкурсу.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# 11 МАЯ — ДЗЕНЬ ДЗЯРЖАЎНАГА ГЕРБА І ДЗЯРЖАЎНАГА СЦЯГА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



**ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!**

Ад усёй душы віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Патрыятызм кожнага чалавека непарыўна звязаны з усхвалявaным, паважлівым стаўленнем да сцяга, герба і гімна сваёй краіны. Без гэтага няма грамадзяніна, няма і дзяржавы.

Наш народ стагоддзямі ішоў да незалежнасці, абараняючы сябе і родную зямлю ад фізічнага і духоўнага прыгнёту. І гэты шлях адлюстраваны ў галоўных сімвалах Рэспублікі Беларусь, якія ўвасобілі ў сабе важнейшыя каштоўнасці і ідэалы беларусаў — любоў да Айчыны, імкненне да свабоды і справядлівасці, да стваральнай працы на сваёй зямлі, жаданне жыць у міры і згодзе ў агульным беларускім доме.

Сёння дзяржаўны сцяг, герб і гімн аб'ядноўваюць нас у адну вялікую сям'ю, напаўняючы сэрцы гонарам за прыналежнасць да народа з багатай гісторыяй, слаўнай сучаснасцю і цудоўнай будучыняй.

Няхай гэта свята яшчэ больш з'яднае ўсіх нас, умацуе высокае пачуццё асабістай адказнасці кожнага грамадзяніна за краіну і гатоўнасці самаахвяравана працаваць дзеля працвітання Радзімы.

Моцнага здароўя, поспехаў, шчасця, радасці і дабрабыту вам, дарагія сябры!

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# РАЗАМ МЫ Ў ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ ВЫСТАІМ

## Значнасць Вялікай Перамогі заключаецца ў выратаванні сусветнай цывілізацыі ад гібелі, і сёння аднадушна прызнаецца перамога савецкага народа

**Пра гэта 8 мая заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Маскве на нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў Арменіі, Беларусі, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана, паведамляе БЕЛТА. Лідары пяці дзяржаў прынялі ўдзел у аглядзе трэніроўкі па кіраванні Узброенымі сіламі Расійскай Федэрацыі ў Маскве, а затым правялі нефармальную сустрэчу ў Крамлі.**

Планавая трэніроўка праходзіла ў Нацыянальным цэнтры кіравання абаронай Расіі. Да адпрацоўкі практычных вучэбна-баявых задач былі прыцягнуты органы ваеннага кіравання ўсіх узроўняў, сілы і сродкі, якія вырашаюць задачы забеспячэння паветрана-касмічнай абароны Расіі. Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што трэніроўка з'яўляецца сведчаннем таго, што «Расіі ёсць чым абараняцца, ёсць чым нанесці ўдар па тых, хто хоча пагрэць рукі тут, на расійскай тэрыторыі, і вырашыць свае пытанні». Паводле яго слоў, для Беларусі гэта мерапрыемства важна тым, што ў дзеянні была прадэманстравана работа комплексаў, якія знаходзяцца на ўзбраенні ў тым ліку і беларускай арміі. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што ваенная моц Расіі з'яўляецца абаронай інтарэсаў Беларусі. На думку беларускага лідара, адсюль і абавязак АДКБ па салідарнасці з Расійскай Федэрацыяй у зоне адказнасці арганізацыі і сумесных дзеянняў на вучэннях.

Адкрываючы нефармальную сустрэчу напярэдадні Дня Перамогі, Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін адзначыў, што агульная перамога над фашызмам і гераізм, адзінства, з'яднанасць у барацьбе з ворагам — і сёння магутны фактар, які аб'ядноўвае ўсе народы былога СССР.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што цяперашні Дзень Перамогі ад папярэдніх адрознівае тое, што сёння аднадушна прызнаецца перамога савецкага народа. «Гэта вельмі важна. Дзякуючы таму, што мы аб'ядналіся, мы не саромеемся гаварыць пра сваю перамогу, а проста падкрэсліваем, прычым усе, значнасць гэтай перамогі, і яна заключаецца ў тым, што мы выратавалі сусветную цывілізацыю ад гібелі, прытушылі галасы нашых нядобразычліўцаў», — сказаў беларускі лідар. Па яго словах, гэта сёння асабліва важна, бо «маладое пакаленне павінна разумець, што гэта была наша перамога, шанаваць і верыць у яе».

Прэзідэнт Беларусі нагадаў, што ў свой час, абмяркоўваючы небяспечныя выклікі і з'явы на тэрыторыі АДКБ, кіраўнікі дзяржаў разважалі пра Афганістан, Сірыю, Ірак, і ўсё гэта здавалася, па меншай меры для Беларусі, далёкім тэатрам ваенных дзеянняў. «Аказваецца, свет настолькі цесны і дынамічны, што гэтая зараза хутка распаўзаецца па планеце, і сёння ўжо каля парога не толькі Таджыкістана, Арменіі, Кыргызстана і Расіі, але і Беларусі з'явіліся гэтыя непрымальныя з'явы», — сказаў беларускі лідар, маючы на ўвазе Украіну.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў гэтым плане ўжо шмат сказана, аднак час мяняе падыходы дзяржаў АДКБ. Паводле яго слоў, ва Украіне адбыліся падзеі, якія не дазваляюць спакойна сядзець убаку і глядзець на тое, што там адбываецца. На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, асабліва гэта тычыцца падзей у Адэсе. «Непрымальныя падобныя дзеянні ў любых дзяржавах, і тым больш непрымальна будзе, калі мы спакойна будзем глядзець на тое, што адбываецца. Гэта перш за ўсё тычыцца Расійскай Федэрацыі і Беларусі. Мы, натуральна, не можам спакойна на гэта глядзець, таму што там нашы людзі і яны заклікаюць аб дапамозе і патрабуюць рэагавання на такія рэчы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Сітуацыя ва Украіне развіваецца вельмі хутка, і што насцярожвае, дык гэта абсалютна неадэкватнае рэагаванне з боку нашых, калі іх так можна назваць, заходніх партнёраў», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. «Добра б ішла дыпламатычная перапалка. Але тут гінуць людзі, і сусветная супольнасць павінна ў гэтым выпадку выступаць кансалідавана, з пазіцыі канкрэтных крытэрыяў, якія пры ацэнцы павінны быць адназначны. Не павінна быць двайных падыходаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі лічыць, што сучасная сітуацыя сведчыць аб тым, што ў свой час было прынята правільнае рашэнне аб аб'яднанні ў Арганізацыю Дагавора аб калектыўнай бяспецы. «Не дай Бог што-небудзь здарыцца, мы павінны быць гатовы стаць спінай да спіны, як кажуць ваенныя людзі, і абараніць наш суверэнітэт і незалежнасць», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. На яго думку, гэта асабліва важна ў той час, калі Захад фактычна пайшоў на эскалацыю напружанасці, але пакуль праз эканоміку, фінансы, спрабуючы ўвесці канкрэтныя эканамічныя санкцыі.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў гэтай сітуацыі неабходна задзейнічаць унутраны патэнцыял любой краіны. «А ён узаемадапаўняльны: калі чагосьці няма ў Расіі, гэтага хапае ў іншых рэспубліках; калі ў рэспубліках чагосьці не хапае, гэта ёсць у Расіі. Таму трэба глядзець больш на тое, каб мабілізавацца і з дапамогай унутраных рэзерваў пераадолець гэтыя наступствы, хоць яны не такія небяспечныя», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Ён звярнуў увагу на тое, што Беларусь ужо не адзін дзясятак гадоў перажывае санкцыі і ведае, што гэта такое і да чаго яны могуць прывесці.

«Мы ў любой сітуацыі выстаім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Вы, Уладзімір Уладзіміравіч, павінны ведаць, што мы будзем побач, плячом да пляча, і я кажу гэта не толькі таму, што тут мы сабраліся перад СМІ. У нас проста выйсця іншага няма, як быць разам. Паасобку — будзе тое, што ва Украіне», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнікі пяці дзяржаў абмяняліся не толькі думкамі па крызіснай сітуацыі ва Украіне, але таксама абмеркавалі актуальныя пытанні супрацоўніцтва паміж краінамі, развіццё інтэграцыйных працэсаў на еўразійскай прасторы, сумесныя меры ў рамках АДКБ па безумоўным забеспячэнні бяспекі народаў.

Пазней адбылася двухбаковая сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў Уладзіміру Пуціну скаардынаваць сумесныя дзеянні па Украіне. Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі прапанаваў абмеркаваць пытанне так званых санкцый у дачыненні да Расіі з боку Захаду. «Спроба націснуць на Расію, натуральна, адбіваецца на нас. І я ўпэўнены, што нам трэба ўнутрана мабілізаваць рэзервы, і мы прымножым тое, што ў нас было, без усялякіх падачак або абяцанняў з боку Захаду», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што напярэдадні была праведзена вялікая работа з прэм'ер-міністрам Дзмітрыем Мядзведзевым, віцэ-прэм'ерамі, міністрамі па даўзгадненні некаторых момантаў дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў закрануць у гутарцы і гэтую тэму.

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за візіт у Маскву напярэдадні Дня Перамогі. «Ведаю, што вы цяпер рыхтуецеся і да гэтага свята, і да чэмпіянату свету па хакеі, спраў шмат, тым не менш, вы знайшлі час, прыехалі. Мне здаецца, гэта натуральна. Расія і Беларусь як былыя часткі Савецкага Саюза ўнеслі вялікі ўклад і панеслі велізарныя страты ў барацьбе з нацызмам. Таму быць у гэтыя дні разам — натуральная справа», — адзначыў ён.

Прэзідэнт Беларусі таксама павіншаваў расіян са святам. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што на 70-годдзе Вялікай Перамогі расіяне і беларусы павінны разам прайсці ў парадзе па Краснай плошчы. «Мы сапраўды былі разам і тады, і пасля гэтага, і цяпер. Думаю, гэта будзе нармальна, калі на Краснай плошчы нашы падраздзяленні будуць прымаць удзел», — сказаў беларускі лідар, звярнуўшы ўвагу на тое, што беларускі бок заўсёды запрашае да сябе на парад часці расійскай арміі.

# МЫ — НАШЧАДКІ ВЯЛІКАГА НАРОДА-ПЕРАМОЖЦЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля ўрачыстай цырымоніі Прэзідэнт расказаў журналістам аб выніках перагавораў, якія адбыліся напярэдадні з кіраўніцтвам Расіі ў Маскве, а таксама адказаў на пытанні.

## Аб выніках паездкі ў Маскву

У прыватнасці, Прэзідэнт паведаміў, што Расія ў маі пералічыць Беларусі $2 млрд крэдыту. «Думаю, што праз тыдзень мы гэтае пытанне вырашым», — адзначыў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэтыя крэдытныя рэсурсы будуць выкарыстаны для папаўнення золатавалютных рэзерваў.

Таксама Беларусь дамовілася з Расіяй аб пастаўках нафты пад поўную патрэбнасць і паэтапнай адмене выплаты экспартных пошлін на нафтапрадукты. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што бакам удалося дасягнуць дамоўленасці па ўсіх пытаннях. У тым ліку ўрэгулявана пытанне продажу аўтамабіляў, якія збіраюць у Беларусі, на расійскім рынку. Па словах кіраўніка дзяржавы, на перамовах у Маскве гэтае пытанне было вырашана лёгка і хутка. «Дамовіліся, што мы каля 2% ад такога класа аўтамабіляў у Расіі паставім адсюль. Гэта будзе 25-30 тысяч аўтамабіляў. Больш мы, напэўна, не атрымаем на існуючых магутнасцях», — растлумачыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што пастаўкі на расійскі рынак аўтамабіляў Geely, выробленых сумесным беларуска-кітайскім прадпрыемствам, не акажуць істотнага ўплыву на гэты рынак і тым больш не абрынуць яго. У будучыні трэба будзе правесці сур'ёзную працу, каб нарасціць лакалізацыю ў вытворчасці машын Geely ў Беларусі, каб айчынных і расійскіх камплектуючых станавілася больш. Плануецца, што за два гады ўзровень лакалізацыі на беларуска-кітайскім прадпрыемстве дасягне 30%, да 2018 года — 50%. У будучыні таксама плануецца істотна нарасціць аб'ёмы вытворчасці.

## Дагавор аб ЕАЭС Беларусь блакіраваць не будзе

Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні журналістаў. Паводле слоў Прэзідэнта, тыя пытанні ў фарміраванні Еўразійскага эканамічнага саюза, па якіх не ўдалося дамовіцца ў фармаце «тройкі», былі вынесены за дужкі і вырашаюцца на двухбаковай аснове. Прэзідэнт адзначыў, што Беларусі ўдалося вырашыць надзённыя пытанні. «Але пры гэтым трэба разумець, што мы там не хадзілі па Маскве і Крамлі з працягнутай рукой, нешта выпрошваючы. Гэта быў кампраміс, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — $1,5 млрд у наступным годзе застаецца ў нас у бюджэце (ад зніжэння аб'ёмаў пералічэння ў расійскі бюджэт экспартных пошлін на нафтапрадукты. — **Заўвага БЕЛТА.**). Плюс $500 млн у будучым годзе Расія пракрэдытуе нашу эканоміку для падтрымання стабільнасці на нашым рынку. У гэтым годзе — $ 2,5 млрд. Гэта буйны крок Расіі ў фінансавым плане, але, з другога боку, і мы вымушаны былі пайсці на ўступкі».

«Блакіраваць падпісанне дагавора, я думаю, нам не варта. Зараз мы зоймемся аналізам усяго таго, пра што мы дамовіліся: што мы ўступаем, што атрымліваем. Усё гэта ўзважым і 29 мая падпішам гэты дагавор», — рэзюмаваў беларускі лідар.

## Разавая дэвальвацыя не плануецца

У Беларусі не плануецца праводзіць дэвальвацыю нацыянальнай валюты, у чарговы раз заявіў Прэзідэнт. «У чарговы раз паўтарыў тое, што заўсёды казаў. Дэвальвацыі, абвалы, войны, канфлікты — усё залежыць толькі ад нас. Калі вы гэтага не захочаце, паверце, гэтага ніколі ў Беларусі не адбудзецца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Як нагадаў кіраўнік дзяржавы, у Беларусі і так з пачатку года адбылася плаўная дэвальвацыя нацыянальнай валюты прыкладна на 7-8%. Улада не прымае спецыяльных мер для ўтрымання курсу беларускага рубля. Прэзідэнт лічыць, што да канца года можа працягнуцца плаўная дэвальвацыя беларускага рубля яшчэ на 5-7%. «Нічога страшнага не адбудзецца, і людзі да гэтага прывыкнуць, і мы вас да гэтага падвядзём праз заработную плату», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, яшчэ раз падкрэсліўшы, што рэзкіх змяненняў курсу не адбудзецца.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі дастатковы аб'ём золатавалютных рэзерваў, каб падтрымліваць стабільную сітуацыю на валютным рынку. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што ў краіне будзе зроблена ўсё, каб не дапусціць разавай дэвальвацыі ў гэтым годзе і ў наступным. Для гэтага ёсць добрыя перадумовы. У прыватнасці, намецілася тэндэнцыя да аднаўлення сусветнай і айчыннай эканомікі. Аднаўляюцца продажы на МТЗ, БелАЗ, «Беларуськаліі». Краіна нарошчвае аб'ёмы вытворчасці і продажу за мяжу, у тым ліку ў Расію, сельскагаспадарчай прадукцыі. «У нас нармальныя перспектывы, але трэба мабілізавацца самім, усяму народу і шукаць шчасце тут. Раю вам: не трэба бегчы ў абменнікі», — сказаў Прэзідэнт.

## Аб перадвыбарнай кампаніі

Прадстаўнікі СМІ папрасілі кіраўніка дзяржавы пракаменціраваць публікацыі ў некаторых сродках масавай інфармацыі аб тым, што ён ужо фактычна пачаў чарговую прэзідэнцкую кампанію і пачынае агітацыю на фоне барацьбы з карупцыяй. «Калі ўжо казаць пра тое, што Лукашэнка пачаў перадвыбарную кампанію... Калі ён яе пачаў, то ў снежні 2010 года. Як толькі скончыліся выбары мінулыя, Лукашэнка пачаў сваю перадвыбарную кампанію. Паверце, гэта так. Калі ты хочаш, каб цябе без праблем абралі Прэзідэнтам, ты павінен з першых дзён працаваць на гэтую прэзідэнцкую кампанію. У нас народ не дурны. Калі ты праспіш 4,5 года, а паўгода будзеш пераконваць, што ты добры, народ пасмяецца. Ты павінен кожны год працаваць, працаваць і працаваць, каб апошні год ці паўгода наогул нічога не рабіць і сказаць: «Людзі, вырашайце». Вось мой прынцып», — сказаў Прэзідэнт.

Што тычыцца барацьбы з карупцыяй, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі створана самае жорсткае заканадаўства ў гэтым плане. Прэзідэнт растлумачыў, што асобнае месца барацьбе з карупцыяй было адведзена ў яго штогадовым пасланні менавіта з мэтай актуалізацыі гэтай праблемы. «Даравання не будзе нікому. Перад законам адказныя ўсе», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Гаворачы аб магчымым пераемніку, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што быў бы толькі рад, каб у Беларусі знайшоўся годны чалавек, які ў будучыні змяніў бы яго на пасадзе кіраўніка дзяржавы. «Я буду толькі рад, калі такі чалавек з'явіцца, таму што я не вечны. Рана ці позна давядзецца сыходзіць, і я вельмі хачу, каб за мной прыйшоў чалавек, які не будзе бурыць і не будзе аплёўваць усё тое, што мы з вамі стварылі, не толькі я. Вось і ўся мая пазіцыя».

## Аб мабілізацыі ўнутраных рэзерваў

«Вы разумееце, што вакол нас даўно, вакол Расіі цяпер спрабуюць сціснуць ціскі фінансавай і эканамічнай блакады. Вы, напэўна, адсочвалі ўчарашнія падзеі (перагаворы ў Маскве. **— Заўвага. БЕЛТА )**: мы ўвесь час гаварылі пра тое, што вельмі многае можам зрабіць, мабілізаваўшы ўнутраныя рэзервы», — адзначыў Прэзідэнт.

У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў дрэваапрацоўчую галіну, якая як у Беларусі, так і ў Расіі забяспечана сыравінай, працуюць адпаведныя прадпрыемствы, аднак часам нават на ўнутраным рынку даводзіцца канкурыраваць з прадукцыяй замежных вытворцаў. «У нас вось гэтай, як кажуць у Беларусі, бязглуздзіцы на кожным кроку. Таму мы павінны разумець, што перш за ўсё — сваё, загрузіць сваіх людзей працай, заплаціць ім нармальную за гэта цану і жыць так, як жыве Германія і іншыя краіны. І тады ніхто ніколі не скажа пра эканамічныя санкцыі, таму што мы будзем самадастатковым забяспечаным народам», — упэўнены кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Калі мы ўсё ў парадак прывядзём, адстроім, нам не страшныя будуць ніякія санкцыі і варожыя сілы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле БЕЛТА.**

# ВІНШАВАННІ СА СВЯТАМ

**У адрас Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі паступілі віншавальныя пасланні ад кіраўнікоў замежных дзяржаў з нагоды гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

# Мір, стабільнасць і бяспека

**8 мая ў Палацы Рэспублікі адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны Дню Перамогі, паведаміла БЕЛТА.**

Выступаючы на сходзе, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Мяжуеў нагадаў, што на гэты год прыпадае некалькі памятных дат, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной. Амаль 70 гадоў таму была праведзена знакамітая аперацыя «Баграціён». «Мы ўсе ганарымся тым, што яе план распрацаваны пад кіраўніцтвам нашага суайчынніка, выдатнага палкаводца Аляксея Антонава», — сказаў ён. Акрамя гэтага, 17 ліпеня 1944 года ў Маскве адбыўся «парад» палонных нямецкіх вайскоўцаў, які ўвайшоў у гісторыю. Перад савецкімі грамадзянамі правялі больш за 57 тысяч нямецкіх афіцэраў і салдат, якія былі ўзяты ў палон у Беларусі.

Аляксандр Мяжуеў звярнуў увагу на той факт, што сёлета ў Беларусі плануецца адкрыць абноўлены дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, што вельмі сімвалічна ў год 70-годдзя вызвалення нашай краіны ад нямецкіх захопнікаў. Дзяржсакратар падкрэсліў, што ў Беларусі надзейна забяспечаны мір, стабільнасць і бяспека.

■ Удзячнасць і павага

# БЕССМЯРОТНЫ ПОЛК НА ФОНЕ БЭЗУ ПЕРАМОГІ

## У Брэсцкай крэпасці прайшлі святочныя мерапрыемствы

У крэпасці рознымі колерамі зацвіў бэз. Яго і ў перадваенныя гады было шмат на тэрыторыі гарнізона. Пра гэта сведчаць лісты жыхароў і абаронцаў крэпасці, якія захоўваюцца ў музеі. І вось нашчадкі герояў вырашылі ў памяць аб тых далёкіх гадах таксама пасадзіць прыгожыя кусты, тым больш, што цвіценне яго акурат супадае са святочнымі днямі. Пры падтрымцы Генеральнага консульства Расійскай Федэрацыі ў Брэсце чацвёрты раз прайшла акцыя «Бэз Перамогі». Актывісты расійскага маладзёжнага руху «Салідарнасць» і грамадскай арганізацыі «Бэз» прывезлі ў Брэст селекцыйныя элітныя кусты бэзу і пасадзілі іх на тэрыторыі мемарыяла. Цяпер прыгожыя і духмяныя гронкі квітнеюць як гімн Перамогі.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.




Мітынг на плошчы Цырыманіялаў, па традыцыі, адкрыў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар.** Губернатар звярнуўся да ветэранаў са словамі найвялікшай павагі і ўдзячнасці за іх ваенны подзвіг, за працу ў пасляваенны час, за цяперашнюю актыўную жыццёвую пазіцыю.

А пасля мітынгу ўдзельнікаў урачыстасцяў чакаў сапраўдны сюрпрыз. Упершыню на галоўнай плошчы крэпасці прайшоў амаль двухгадзінны канцэрт навучэнцаў і выкладчыкаў Брэсцкага музычнага каледжа. Канцэрт арганічна ўпісаўся ў агульную праграму свята. Урачысты настрой падтрымлівалі творы ваеннай тэматыкі. Сярод гледачоў канцэрта былі нават заўважаны салдаты «Бессмяротнага палка». Аднайменная акцыя стала адной з галоўных цікавінак сёлетняга 9 Мая. Задоўга да свята па радыё, у газетах, сацыяльных сетках арганізатары заклікалі ўнукаў і праўнукаў франтавікоў прыйсці на Дзень Перамогі з партрэтамі сваіх гераічных продкаў. У святочным шэсці гэтая калона выглядала сапраўды як бессмяротны полк. На партрэтах яны былі яшчэ маладыя і прыгожыя. Такімі яны выканалі свой вайсковы і грамадзянскі абавязак і засталіся не толькі ў сямейных архівах, у памяці родных, але і ў гісторыі краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Свята

# ПЕРАМОГА: АДНА НА ЎСІХ І Ў КОЖНАГА — СВАЯ

**З года ў год на 9 Мая тысячы людзей выходзяць на вуліцы, многія з іх — цэлымі пакаленнямі. А гэта значыць, свята працягвае жыць. Сёлетняе ж святкаванне Дня Перамогі ў Мінску супала з адкрыццём чэмпіянату свету па хакеі, і таму атмасфера ў сталіцы была надзвычай ажыўленая. Кветкі, шарыкі, сцягі, усмешкі, часам непрыхаваныя слёзы і... узмоцненыя меры бяспекі.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нягледзячы на сталы ўзрост, Мікалай Захарчанка і ў кросе паўдзельнічаў, і ва ўрачыстым шэсці.

## «Маладыя глядзяць са здзіўленнем і павагай»

Каб паглядзець урачыстае шэсце на плошчы Перамогі, якое традыцыйна дае «старт» святкаванню 9 Мая, мінчанам і гасцям сталіцы давялося пастаяць у чэргах да кантрольна-прапускных пунктаў і прайсці працэдуру агляду супрацоўнікамі міліцыі. Правяралі гледачоў і на выхадзе з парку Горкага. Але на патрабаванні бяспекі людзі асабліва не наракалі, і пасля шэсця ў парку, які стаў адной з цэнтральных святочных пляцовак, літаральна складана было павярнуцца. На галоўнай сцэне тут пачаўся канцэрт. Побач свае вырабы прадставілі майстры розных відаў і тэхнік ручной працы, прапануючы набыць мяккія цацкі, упрыгажэнні, сувеніры. Сваю акцыю зладзілі і студэнты Мінскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа: дзяўчаты ў белых халатах і строях сясцёр міласэрнасці замяралі ўсім ахвотным вагу, рост і артэрыяльны ціск, а таксама вучылі... спавіваць немаўлят.

Канцэрт прывабіў мноства гледачоў, але некаторыя ўсё ж аддалі перавагу спакойнаму адпачынку на свежым паветры. Для ўдзельніцы вайны Валянціны Прохараўны Бельскай гэты дзень і без эстрадных выступленняў надзвычай насычаны. У свае 85 ёй ужо цяжка хадзіць, таму на свята яе суправаджае сын. Тым не менш Валянціна Прохараўна адольвае ўсё шэсце. Маленькая сівая жанчына пад перазвон узнагарод на грудзях прызнаецца, што настрой у яе адначасова і добры, і сумны. І ўсё ж перaважае радасць, якая захоўваецца ў сэрцы на ўвесь год.

— Маладыя глядзяць цяпер на ветэранаў са здзіўленнем і з павагай, бо жывых сведкаў вайны вельмі мала засталося, — адзначае сын Валянціны Прохараўны Яўген. — Але ўсё ж кожны год віншуюць, дораць кветкі — гэта вельмі прыемна.

У сям'і Бельскіх склалася традыцыя святкавання Дня Перамогі: пад'ём а палове шостай, пасля — шэсце, далей — прагулкі па горадзе. Пасля вяртання дадому — святочны стол, «франтавыя» сто грамаў і віншаванні знаёмых.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У мінскім парку Чалюскінцаў студэнты Універсітэта культуры прапанавалі для самых маленькіх гасцей свята цікавыя гульні.

## Вайна, што загартавала і згуртавала

Сярод наведнікаў парку ўвагу да сябе прыцягваў пажылы мужчына ў марской форме і фуражцы з надпісам «Балтыйскі флот». Ветэран іграў на гармоніку. З ім ахвотна фатаграфавалася моладзь. Мікалай Захарчанка *(на фота зверху)* штогод прыходзіць ускладаць кветкі да помніка Перамогі. Праўда, кажа ён, сёлета ўпершыню прыйшоў з кіем, бо хадзіць ужо цяжка. І нязменна бярэ з сабой гармонік. А яшчэ ў 84 гады мужчына напярэдадні свята ўдзельнічаў ва Усебеларускім прабегу «Перамога».

«Вы — сапраўдны?» — раптам падышла да ветэрана кабета, што праходзіла побач. І стала горача віншаваць. Зусім незнаёмых людзей нават праз 70 гадоў пасля заканчэння аб'яднала вайна: Мікалай Аляксеевіч быў вязнем канцлагера ў Азарычах, там загінулі яго маці і брат. А жанчына распавяла, што ў тым жа канцлагеры была маці яе сяброўкі.

Адметна, што да Дня Перамогі спрычыніліся не толькі беларусы, але і госці з-за мяжы. На гуляннях можна было пабачыць хакейных балельшчыкаў са Славакіі, Расіі і іншых краін з сімволікай свята. Парадавала і дасведчанасць хлопца і дзяўчыны, што прыехалі з Кітая навучацца ў нас журналістыцы. «Мы ведаем, што ў вас сёння за свята — Дзень Перамогі. І яшчэ мы ведаем газету «Звязда», — нечакана прызналіся замежнікі і папрасілі сфатаграфаваць іх на фоне святочнага дзейства.

9 Мая, здаецца, увесь горадператварыўся ў адно суцэльнае месца адпачынку. У кожным раёне праходзілі свае канцэрты і святочныя акцыі. Гулянні шырока разгарнуліся каля Палаца спорту, дзе гледачоў забаўляла святочная праграма «З Днём Перамогі», вiраваў гандаль прамтаварамі і сувенірамі ад народных майстроў. Сярод іншых гасцей тут быў заўважаны і старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька. «Настрой вельмі добры!» — сказаў ён карэспандэнту «Звязды» і павіншаваў са святам, але падрабязна апісваць свае эмоцыі не стаў.

Зрэшты, напэўна, у гэты дзень яны ва ўсіх былі падобныя. Старэйшае пакаленне ўспамінала ваенныя гады і цешылася тым, што іх нашчадкі ўжо сем дзесяцігоддзяў жывуць у міры. А моладзь, няхай і без усведамлення жахаў той вайны, але з задавальненнем глядзела канцэрты, ела шашлыкі, гуляла і проста радавалася цёпламу выхадному дню.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

На беразе Свіслачы аматары спорту паказвалі сваё майстэрства.

■ Яднанне пакаленняў

## ДАШЛІ ПАШТОЎКУ ВЕТЭРАНУ

**Каля 200 хлопчыкаў і дзяўчынак удзельнічалі ў міжнароднай акцыі «Чытаем дзецям пра вайну», якая прайшла ў дзіцячых бібліятэках абласнога цэнтра. Ушанаваўшы хвілінай маўчання памяць загінулых, яны чыталі ўголас кнігі Льва Касіля, Анатоля Міцяева, Сяргея Аляксеева. Свае творы пра вайну дзецям прачытаў гродзенскі паэт Віктар Кудлачоў.**

Тым часам у ГрДУ імя Янкі Купалы адкрылася выстава фатаграфій-партрэтаў ветэранаў вайны, бабуль і дзядуляў студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта — з аповедам пра іх жыццёвы шлях. Праходзіў конкурс мастацкага чытання вершаў «Салдатам Вялікай Перамогі прысвячаецца». Моладзь таксама ініцыявала акцыю «Павіншуй ветэрана з перамогай» у сацыяльных сетках. Ідэя яе ў тым, што кожны можа пакінуць свой нумар тэлефона і, атрымаўшы ад удзельнікаў праекта адрас ветэрана, накіраваць яму віншавальную паштоўку.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Танцуюць усе!

## ВАЛЬС НАД СОЖАМ

**Больш за сто танцавальных пар — пераможцаў конкурсу сярод выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі — выканалі Майскі вальс І. Лучанка падчас урачыстага святкавання Дня Перамогі ў Гомелі.**

У Гомельскай вобласці сёння пражываюць 3,3 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. 40 з іх былі запрошаны на ўрачысты прыём да старшыні Гомельскага аблвыканкама ў гонар Дня Перамогі. Уладзімір Дворнік адзначыў, што жыхарам Беларусі трэба вучыцца ў ветэранаў патрыятызму.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ «Прывітанні» з фронту

## ВЕРНУТЫЯ З НЕБЫЦЦЯ

**У магілёўскай абласной бібліятэцы імя Леніна адкрылася выстава, дзе можна ўбачыць фота і дакументы тых, каго амаль 70 гадоў лічылі зніклымі без вестак.**

Падарунак ад Рыгора Плахатнюка.




Вочы выхопліваюць з ваеннага ліста некалькі радкоў... Аўтар іх яшчэ жывы. Ён ганарыцца тым, што ім, абаронцам, удалося затрымаць на Буйніцкім полі пад Магілёвам 39 варожых танкаў... Але яго родным так і не пашчасціць дачакацца свайго сына... Ён знік без вестак, як і ўсе тыя, прозвішчы якіх пералічаны ў лісце.

Але менавіта дзякуючы гэтаму пасланню праз шмат гадоў пасля тога ліпеньскага «гарачага» дня на Дняпроўскім рубяжы яны «ўваскрэслі». Знайшліся неабыякавыя людзі, якія вярнулі іх з небыцця. Адзін з раздзелаў выставы «Твары пошуку» прысвечаны менавіта тым, чые імёны былі ўстаноўлены ў XXI стагоддзі.

— Гэтымі матэрыяламі з намі падзяліўся Рыгор Плахатнюк — гісторык-пошукавік з Варонежа, — удакладняе загадчыца аддзела абласной бібліятэкі Тамара Калініна. — Ён унук салдата 388-га палка, які прымаў удзел у абароне Магілёва. Мы супрацоўнічаем з ім з 2011 года, і з яго дапамогай фонд бібліятэкі папоўніўся рэдкімі матэрыяламі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

■ Успаміны праз слёзы

## КАБ ЛЮДЗІ НЕ ВЕДАЛІ ВАЙНЫ

**Па традыцыі, на плошчы Перамогі ў Віцебску кіраўнікі вобласці павіншавалі гараджан са святам. Усе ахвотныя змаглі азнаёміцца з ваеннай тэхнікай, наведаць выставы пад адкрытым небам, паглядзець святочны канцэрт. А вечарам над плошчай Перамогі спакой мірнага неба парушылі залпы феерверку. Падчас святкавання карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з ветэранамі.**

— Каб людзі ніколі не ведалі вайны — гэта самае вялікае маё пажаданне, — сказаў ветэран Вялікай Айчыннай **Віктар Дзям'янавіч Цярэшчанка,** які жыве ў пасёлку Копці Віцебскага раёна. Яму пайшоў 89 год. Ён быў адным з ініцыятараў стварэння ў населеным пункце воінскага мемарыяла.

На тэрыторыі мемарыяла ёсць танк Т-76, які ў 1995 годзе быў падораны вяскоўцам Міністэрствам абароны. Сярод помнікаў, да якіх мае непасрэднае дачыненне Віктар Цярэшчанка — сыну Сталіна Якаву Джугашвілі (ён у 1941 годзе ваяваў на тэрыторыі Віцебшчыны. — **Аўт**.), французскім лётчыкам са знакамітага авіяцыйнага палка «Нармандыя», якія ў 1944 годзе вызвалялі Віцебшчыну. Летась у Копцях паставілі помнік Герою Савецкага Саюза Георгію Сцяпанавічу Грыгор'еву, які паўтарыў подзвіг Аляксандра Матросава. Школа носіць імя героя. Усяго на тэрыторыі мемарыяла больш за пяцьдзясят помнікаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

**ОАО «Слуцкий льнозавод»**
**ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Слуцкий льнозавод».**
Дата и время проведения: **21 мая 2014 года в 15.00.**
Место проведения:
**г. Слуцк Минской области, ул. Ленина, 300, актовый зал.**

**Повестка дня:**
1. Об утверждении результатов закрытой подписки на акции.
2. Об увеличении уставного фонда Общества.
3. Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций.
4. О внесении изменений в Устав ОАО «Слуцкий льнозавод».
5. О создании комиссии по жилищным вопросам. Утверждение Положения по постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий, о порядке выделения и о порядке продажи заселенных жилых помещений.

**Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45.**
Для регистрации акционеров необходимо иметь:
юридическим лицам: руководителям — служебное удостоверение (иной подтверждающий документ и паспорт);
иному представителю: доверенность на представление юридического лица на собрании акционеров и паспорт;
физическим лицам: паспорт; представителям — доверенность, удостоверенную в установленном порядке, и паспорт.
Информация по вопросам повестки собрания предоставляется акционерам ОАО «Слуцкий льнозавод» по месту нахождения ОАО: **г. Слуцк, ул. Ленина, 300 с 8.00 до 17.00.**
**Телефоны для справок (8 01795) 61526; 61655.**
УНП 690657228 *Наблюдательный совет ОАО «Слуцкий льнозавод».*

Утерянные страховые полисы ЗСАО «БелИнгострах» добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП, серии ИС № 0490653, № 0494565 **считать недействительными.**
УНП 100219645

# У МІНСКУ Б'ЕЦЦА ХАКЕЙНАЕ СЭРЦА!

## У Дзень Перамогі на дзвюх сталічных лядовых пляцоўках стартаваў чэмпіянат свету па хакеі

**Учора ў Мінску было па-святочнаму прыгожа. Цёплае майскае сонца залівала сталічныя праспекты, па якіх вандравалі шматлікія вясёлыя балельшчыкі ў рознакаляровых хакейных світарах. Славакі, расіяне, швейцарцы, чэхі, шведы, фіны... Іх дарогі вялі ў дзве кропкі сталіцы, якія на некалькі тыдняў, як магніт будуць прыцягваць спартыўных заўзятараў. «Мінск-Арэна» і «Чыжоўка-Арэна» — паролі і месцы сустрэчы балельшчыкаў, якія змяніць нельга. Карэспандэнты «Звязды» перадаюць з галоўных хакейных кропак сталіцы.**



Замежныя балельшчыкі на мінскіх вуліцах сёння не рэдкасць.

## ШВЕЙЦАРЦЫ РЫХТУЮЦЦА ДА РЭВАНШУ

Здаецца, на выхадзе са станцыі метро «Аўтазаводская» ёсць толькі адзін далейшы напрамак — да «Чыжоўка-Арэны». Стракаты і шумны натоўп адразу падказвае, дзе ў гэтыя дні адбываецца галоўная спартыўная падзея года.

На аўтобусным прыпынку ўвагу прыцягвае кампанія хлопцаў у аднолькавых чырвоных футболках. Адзін з іх абарочваецца. На спіне бачу белы крыж і разумею, што перада мной балельшчыкі зборнай Швейцарыі. Хлопцы прыехалі з Лазаны, французскай часткі альпійскай краіны.Таму, акрамя сваёй зборнай, будуць «хварэць» за французаў.

— На матчы Швейцарыі мы загадзя набылі абанементы. А вось на гульні Францыі плануем купляць квіткі ўжо ў Мінску, бо яшчэ адзін абанемент мы б не пацягнулі, — усміхаецца Джуліян, студэнт біялагічнага факультэта.

Размясціліся хлопцы ў фан-вёсцы. Першую палову дня даследавалі раён і вывучалі маршруты да лядовых арэн.

— Вось едзем на «Чыжоўка-Арэну», каб паглядзець, дзе будзе выступаць французская зборная. Добра, што ад метро дабірацца не вельмі доўга, — падключаецца да размовы Лені, аднакурснік і сябар Джуліяна. — Нас здзівіла, што ў Мінску такі кампактны метрапалітэн: усяго толькі дзве лініі. Затое для нас гэта прывычна, бо ў Лазане падобная схема метро. Гэта, дарэчы, адзіны горад у Швейцарыі, дзе ёсць падземка.

Хлопцы кажуць, што пасяліліся ў фан-вёсцы нават не з-за эканоміі — так прасцей адчуць неверагодную атмасферу хакейнага свята.

— Учора пазнаёміліся з нямецкімі дзяўчатамі. Паабяцалі суправаджаць іх на працягу ўсяго турніру. Але нашы зборныя знаходзяцца ў адной групе — гэта трохі ўскладняе сітуацыю, — смяецца Лені.

Напрыканцы Джуліян узгадвае:

— О, мы ж з беларусамі будзем гуляць! Нічога асабістага, але спадзяюся, нашы хлопцы атрымаюць перамогу. Сёлета мы будзем змагацца толькі за «золата»! (На леташнім чэмпіянаце зборная Швейцарыі ў фінале саступіла шведам. — **Аўт**.)

На пляцоўцы перад арэнай мітусяцца сек'юрыці і валанцёры — вырашаюць арганізацыйныя пытанні перад сустрэчай фанатаў. Побач разгарнуўся сапраўдны кірмаш. Асабліва шмат гандлёвых кропак афіцыйных спонсараў чэмпіянату. Тут жа летняя кавярня, дзе балельшчыкі чакаюць матчаў сваіх фаварытаў. За адным столікам адпачываюць славакі.

— А яшчэ казалі, што больш за ўсіх на чэмпіянат прыедзе латышоў, — прагаворваю ўслых, успамінаючы, што ўжо ў горадзе бачыла славакаў.

— Дык хакей у нас спорт нумар адзін! — па-руску, з малапрыкметным акцэнтам звяртаецца да мяне адзін са славацкіх балельшчыкаў.

— Зусім як і ў нас, — ветліва адказваю госцю.

Мілан прыехаў у Мінск разам з братам і яго сям'ёй. Кампанія з шасці чалавек арандавала трохпакаёўку непадалёк ад Нямігі.

— Тут вельмі прыгожа, і, да таго ж, зручна дабірацца да арэн, — кажа мужчына. — Вядома, нятанна, але мы былі гатовы да сур'ёзных выдаткаў. Прыйшлося ўзяць на працы незапланаваны водпуск, але гэта таго варта.

Пытаюся, адкуль карэнны славак так добра ведае рускую мову.

Пяць гадоў таму на адпачынку ў Іспаніі пазнаёміліся з сям'ёй з Беларусі. Яны з Брэста. Пасябравалі, пачалі падтрымліваць сувязь і вывучылі рускую мову. Дарэчы, пасля завяршэння турніру плануем наведаць сяброў. Яны абяцалі паказаць Белавежскую пушчу.

У хакейных прагнозах адносна зборнай Славакіі Мілан стрыманы і разважлівы:

— У чвэрцьфінал павінны выходзіць, а далей будзе больш складана. Тым не менш у нас ёсць квіткі на фінал. Спадзяюся, каманда нас не падвядзе.

## РУСКІЯ ІДУЦЬ?

Ажыятаж на «Мінск-Арэне», галоўнай пляцоўцы турніру, адчуваўся загадзя. Рабочыя спяшаліся як мага хутчэй усталяваць вялікую сцэну для канцэртнай праграмы. Прадаўцы на прылаўках акуратна раскладвалі сувенірную прадукцыю, а патэнцыяльныя гледачы чакалі каля кас доўгачаканыя квіткі. Што ў такім разе казаць пра журналістаў, якія яшчэ ў чацвер акупавалі прэс-цэнтр і па нябачных інтэрнэт-каналах адпраўлялі з Мінска ў рэдакцыі рэпартажы з трэніровак сваіх зборных! Але ўсе мы разам узятыя былі нечым маленечкім у параўнанні з той армадай балельшчыкаў, якая высадзілася каля «Мінск-Арэны» ўчарашнім вечарам. Першымі тут мацнейшага паміж сабой выяўлялі зборныя Расіі і Швейцарыі.

Нашых усходніх суседзяў у Мінску не злічыць! Асаблівыя прыкметы — дзяржаўныя сцягі, шапкі-вушанкі, георгіеўскія стужкі, майкі з выявай герба і надпісамі «Овечкин», «Малкин» на спінах, і, безумоўна, аўтамабілі з адпаведнымі нумарамі. На прыступках «Мінск-Арэны» нагогул сустрэў дзвюх дзяўчат у какошніках і шырокіх сукенках. Геаграфічнае прадстаўніцтва у расіян таксама багатае — ад Калінінграда да Ангарска.

— Нам здалося, што на трыбунах тысяча швейцарцаў, астатнія балельшчыкі з Расіі, — усміхаецца Настасся, дзяўчына ў чырвонай майцы, якая прыляцела разам з сяброўкамі з Благавешчанска толькі на выхадныя. — Правялі 7 гадзін у паветры і 8 у цягніку. У вашай сталіцы мы ўпершыню. Адразу заўважылі адкрытасць і ветлівасць мясцовых жыхароў. Розніца ў гэтым плане з Расіяй адчуваецца.



Першая гульня — жорсткая барацьба.

У Мінск зборная Расіі прыехала з адной мэтай — перамагаць. Няўдалае выступленне на Алімпіядзе не пакідае падапечным Алега Знарка іншых варыянтаў, каб хоць неяк рэабілітавацца перад роднымі гледачамі. У першым перыядзе расіяне добра прыціснулі швейцарцаў і ў выніку адправілі тры шайбы ў вароты Леанарда Джэноні. А пасля ўмацавалі сваю перавагу яшчэ двума галамі.

■ Эксперт

## «ТРЫБУНЫ БУДУЦЬ ПОЎНЫЯ»

**Сваімі думкамі і чаканнямі ад чэмпіянату са «Звяздой» падзяліўся Міхаіл ЗАХАРАЎ, галоўны трэнер сталічнага «Юнацтва», які ў свой час двойчы ўзначальваў зборную Беларусі па хакеі.**



Фота Дар'і БУРАКІНАЙ.

***— Міхаіл Міхайлавіч, такой канцэнтрацыі вядучых зборных планеты ў нашай сталіцы яшчэ ніколі не было.***

— Безумоўна. Чэмпіянат свету па хакеі — гэта, найперш, вялікае свята для нашай рэспублікі. І я вельмі ўсцешаны тым, што менавіта хакеісты прывезлі да нас буйны спартыўны форум. Трыбуны на ім будуць поўныя. Кажуць, што і ў гасцініцах няма вольных нумароў. Падобнага я нават не чакаў. Атмасфера вакол хакея вельмі добрая.

***— Якія ў вас прагнозы на сёлетні турнір?***

— Я пагутарыў з хакеістамі нашай зборнай: Аляксеем Калюжным, братамі Касціцынымі, Міхаілам Грабоўскім. Яны малайцы. У іх добры настрой напярэдадні матчаў. Лічу, што ў васьмёрку мацнейшых Беларусь павінна патрапіць.

***— Чэмпіянат прымаюць дзве сталічныя хакейныя пляцоўкі. Якая з іх вам найбольш падабаецца?***

— Я размаўляў з Рэнэ Фазэлем, і ён прызнаўся, што прадстаўнікі Міжнароднай хакейнай федэрацыі зачараваны і «Мінск-Арэнай», і асабліва «Чыжоўка-Арэнай», якую многія лічаць галоўнай хакейнай пляцоўкай Мінска. Справа ў тым, што яе будавалі ўжо пасля «Мінск-Арэны». І ўсіх тых недахопаў, якія былі раней, атрымалася пазбегнуць.

***— Звычайна на пасляалімпійскі чэмпіянат свету, якім з'яўляецца і першынство ў Беларусі, многія зборныя прыязджаюць без лідараў.***

— Можа і так. Але на гэта не трэба звяртаць увагу. Я неяк размаўляў са сваім сябрам і спытаў у яго: «Ці ведаеш, колькі хакеістаў з алімпійскай зборнай Швецыі не прыедзе ў Мінск?». Ён не ведае. А ці ведаеце, колькі ўдзельнікаў Гульняў прыляцела з Канады? Ніводнага! Але ўсё роўна стадыёны будуць запоўнены. Фінляндыя, Чэхія, Швецыя... Людзі пойдуць менавіта на зборныя, а не на імёны.

***— А ці склалі свой асабісты графік наведвання гульняў чэмпіянату?***

— Я буду старацца наведваць усе матчы. Мне цікава ўбачыць у дзеянні ўсе зборныя. У любым выпадку каманды ўсе моцныя. Памятаю, як на першынство свету ў Рыгу, у 2006 годзе, Швецыя прыехала толькі з некалькімі гульцамі алімпійскага складу. Аднак гэтая зборная выглядала вельмі добра і ў выніку стала чэмпіёнам.

***— Хто можа стаць галоўнай неспадзяванкай турніру?***

— Зборная Расіі. Яе ўзначаліў Алег Знарок, вельмі сур'ёзны трэнер. Пад яго кіраўніцтвам каманда паспела плённа папрацаваць. У яго хлопцаў выпрацаваўся добры баявы дух. Мяркую, што Расія згуляе ў фінале.

■ Імгненні хакейнага свята









**Матэрыялы падрыхтавалі Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ і Тарас ШЧЫРЫ. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ, Анатоля КЛЕШЧУКА, Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# ПАМЯЦЬ — АДНА

## На Вілейшчыне алею ў памяць аб загінулых салдатах Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай трыццаць гадоў таму садзілі пісьменнікі-франтавікі

**2014 год адметны не толькі сямюдзесяццю гадамі міру на нашай зямлі. Сёлета спаўняецца сто гадоў з таго часу, як пачалася Першая сусветная вайна. Тады на вайну пайшлі бацькі і дзяды тых, каму выпала абараняць Айчыну ад фашысцкай навалы...**




Непадалёк ад Вілейкі больш за два гады праходзіла лінія руска-германскага фронту. У лесе каля вёскі Заброддзе тады дыслацыраваўся лазарэт 29-й пяхотнай дывізіі 20-га корпуса 2-й Рускай арміі. Цяпер аб ім напамінаюць могілкі, дзе апошні спачын знайшлі дзве з паловай тысячы чалавек. Пэўна, яны б зніклі з твару зямлі, калі б адраджэннем памяці аб тых даўно мінулых часах не заняўся мастак Барыс Цітовіч. І вось ужо ў трыццаты раз жыхары навакольных вёсак і шматлікія госці са Смаргоні, Мінска, Масквы і іншых гарадоў колішняй Расійскай імперыі сустракаюцца на тых лазарэтных могілках у Дзень Перамогі. Прыязджаюць сюды кожны год і турысты з замежжа, чые продкі змагаліся на франтах Першай сусветнай сто гадоў таму. Сёлета з канцэртнай праграмай прыбылі госці з Вялікабрытаніі.

— У гэтых магілах пахаваны памерлыя ў лазарэце ад ран і салдаты, якіх прывозілі з палёў баёў са Смаргоншчыны, — гаворыць Барыс Цітовіч. — Могілкі сталі апошнім прытулкам і для тых, хто не перажыў атаку атрутных газаў і тыф... Тут ляжыць вельмі шмат юнакоў, каму будзе вечна па 19-20 гадоў. Вось толькі імёны многіх з іх дагэтуль застаюцца невядомымі. Пакуль што з дапамогай розных крыніц удалося ідэнтыфікаваць усяго дзесяць чалавек. Але ёсць надзея, што з цягам часу гэтыя белыя гістарычныя плямы ўсё ж пачнуць знікаць. Пахаваны тут і бацькі тых, хто падарыў нам 69 гадоў таму свята Перамогі. Таму мы і аб'яднаналі памінальныя мерапрыемствы па ахвярах дзвюх сусветных калатнеч...

Дзякуючы Барысу Цітовічу каля вёскі Рускае Сяло, дзе былі пахаваны воіны 20-га армейскага корпуса, быў усталяваны крыж з выявай Спаса Нерукатворнага. У вёсцы Бараўцы пабудавана каплічка ў памяць 80-х угодкаў заканчэння Першай сусветнай... Мясцовыя і раённыя ўлады таксама не застаюцца ў баку ад захавання памяці.

Хрэсны ход у памяць загінулых амаль стагоддзе таму, які адбываецца пасля паніхіды, прыводзіць у вёску Заброддзе, дзе трыццаць гадоў назад з'явілася алея, якую садзілі пісьменнікі, што прайшлі праз ваеннае ліхалецце. Былі сярод іх Алесь Адамовіч і Васіль Быкаў... Тут узведзена каплічка-помнік святых дабраверных князёў Барыса і Глеба. Яна ж адначасова з'яўляецца музеем Першай сусветнай вайны. Побач з ёй сёлета быў усталяваны і асвечаны камень, на якім выбіты імёны жыхароў Забраддзя, якія пайшлі абараняць Айчыну падчас руска-японскай, Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. У каменным мартыралогу значыцца 16 прозвішчаў.



І было б вельмі добра, калі б такая традыцыя ўшанавання продкаў прыйшла ў кожную беларускую вёску. Бо ў тых, хто не памятае сваёй мінуўшчыны, няма будучыні...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК. Фота аўтара.**

*Вілейскі раён.*

Сумесны праект Полаччыны і газеты «Звязда»
«Урочышча Пяскі»

# АБАВЯЗАК СЫНОЎ

## Надышоў час ушанаваць памяць забытых ахвяр Вялікай Айчыннай вайны


Наталля ГУЙВІК


Зінаіда ТРАФІМАВА-ПАНКОВА


Ларыса БРУЕВА


Рыгор СКВАРЦОЎ


Віктар ШУМСКІ


Аляксандр САМОВІЧ


Хольгер РАПІЁР


Дамініка КАЛІКІА


Сяргей АФАНАСЬЕЎ


Ірына ШЫШКОВА

**Для нашых дзядоў тая вайна была жыццём. Для нас — гісторыяй. Але дагэтуль у гісторыі гэтай вайны шмат непрачытаных старонак. І адна з такіх — савецкія ваеннапалонныя. Газета «Звязда» разам з дэпутатам ніжняй палаты беларускага парламента Наталляй Гуйвік правяла «круглы стол», прысвечаны месцу масавага пахавання савецкіх ваеннапалонных у Полацку. Мэта — зрабіць яшчэ адзін крок у бок аднаўлення гістарычнай справядлівасці. Яшчэ адзін крок у справе ўшанавання памяці тых, у каго тая вайна адняла жыццё.**

### НАДНАЦЫЯНАЛЬНЫ І НАДКАНФЕСІЙНЫ

**Наталля ГУЙВІК, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— На ўскраіне горада Полацка, у Спаскім гарадку, існуе памятнае сваім трагізмам месца, вядомае як урочышча Пяскі. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі ў перыяд з 1941 па 1944 гады там знайшлі свой апошні прытулак ахвяры гітлераўскага рэжыму. На невялікай плошчы пахаваны астанкі дзясяткаў тысяч людзей: ваеннаслужачых, падпольшчыкаў, партызан, мірных жыхароў розных нацыянальнасцяў і рознага веравызнання. Колькі іх — дакладна невядома. Ёсць даныя пра 38 тысяч ваеннапалонных нямецкага перасыльнага лагера Дулаг-125, які знаходзіўся паблізу. Разам з тым, у акце Надзвычайнай камісіі па ўстанаўленні і расследаванні фактаў злачынстваў, здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі, гаворыцца, што ў Полацку з 15 ліпеня 1941 года па 4 ліпеня 1944-га было знішчана больш за 150 тысяч савецкіх людзей, у тым ліку ваеннапалонных звыш за 100 тысяч чалавек. Акт датуецца 7 мая 1945 года.

Урочышча Пяскі знаходзіцца паміж двума былымі лагерамі для савецкіх грамадзян: з аднаго боку — вышэйзгаданы Дулаг-125, з другога — лагер для мірнага насельніцтва. У апошнім утрымліваліся людзі, у тым ліку жанчыны і дзеці, прыгнаныя з партызанскіх зон, захопленых акупантамі падчас карных аперацый. Сведкі паказваюць, што ва ўрочышчы Пяскі хавалі тых, хто памёр у гэтым лагеры, а таксама расстрэльвалі падпольшчыкаў і партызан, якіх прывозілі з гарадской турмы і гестапа.

**На тэрыторыі нашай краіны знаходзілася 257 месцаў прымусовага ўтрымання ваеннапалонных у 158 населеных пунктах. І толькі ў 16 лагерах захавалася інфармацыя пра колькасць загінулых — 571 434 чалавекі.**

Жыхары Полацка і Полацкага раёна ведалі трагічную гісторыю гэтага месца і ўвесь час імкнуліся ўвекавечыць памяць ахвяр фашызму. Аднак таго, што было зроблена дагэтуль, недастаткова. Справа ў тым, што людзі ў гэтым месцы пахаваны наспех, магілы неглыбокія. Месцамі астанкі ледзь прыкрыты пяском, які размываецца падчас дажджу, разносіцца ветрам і з-за гэтага яны аказваюцца на паверхні.

Таму ў 2010 годзе Полацкае аддзяленне Беларускага фонду міру зноў звярнулася ў Полацкі гарвыканкам і Полацкі гарадскі Савет дэпутатаў з просьбай аб стварэнні на гэтым месцы мемарыяла. З таго часу і па сёння вядуцца работы па зборы сродкаў і будаўніцтве годнага помніка.

Кошт мемарыяла складае каля 5 млрд рублёў. Сума ахвяраванняў (на сёння) — 600 мільёнаў рублёў. Дадаткова дзяржавай выдзелена 480 мільёнаў. На гэтыя грошы ўстаноўлена Сцяна памяці, знак, які сімвалізуе, што тут спачываюць прадстаўнікі рознага веравызнання, выраблена агароджа, якая пакуль не ўстаноўлена, бо неабходна добраўпарадкаваць само месца пахавання. Грамадскія арганізацыі горада-пабраціма Фрыдрыхсхафен (Германія) паабяцалі аплаціць выраб партала, які каштуе 30 тысяч еўра.

Прашу ўдзельнікаў «круглага стала» садзейнічаць пошуку імён тых, хто пахаваны ў Пясках, іх сваякоў, а таксама аказанню матэрыяльнай дапамогі ў будаўніцтве мемарыяла, каб да 9 мая 2015 года мы змаглі яго завяршыць. Газета «Звязда» ў кастрычніку 2013 года аб'явіла спецыяльны праект па інфармацыйнай падтрымцы збору сродкаў на мемарыял, паставіўшы мэту — вывесці яго стварэнне на рэспубліканскі і міжнародны ўзроўні.

Спадзяюся, што комплекс стане сапраўдным сімвалам яднання людзей, сімвалам агульнай памяці.

**«ЗВЯЗДА»:**

**— На наш «круглы стол» мы запрасілі жанчыну, бацька якой з вялікай доляй верагоднасці пахаваны ў Пясках. Зінаіда Іванаўна Трафімава-Панкова, пенсіянерка і ўдава, пералічыла на будаўніцтва мемарыяла ледзь не самую вялікую суму сярод прыватных асоб — 2 мільёны рублёў.**

**Зінаіда ТРАФІМАВА-ПАНКОВА:**

— Мой бацька, Іван Елісеевіч Панкоў, жыхар горада Полацка, у першы дзень вайны быў прызваны ў Чырвоную Армію. Пад Лідай ён трапіў у акружэнне, але змог прабрацца дадому. На пачатку восені 1943 года быў схоплены гестапа разам з іншым палачанінам — Коленькам Шпацэвічам. Некаторы час іх утрымлівалі ў гестапа, потым у гарадской турме. Бацьку было 33 гады, а Коленьку Шпацэвічу — 19.

**«ЗВЯЗДА»:**

**— Зінаідзе Іванаўне тады было 10 гадоў. Яна памятае, як прыйшлі па бацьку. Тады яна не ведала, што ён прымаў удзел у арганізацыі ўцёкаў ваеннапалонных з полацкіх лагераў, дапамагаў ім перабрацца да партызан, забяспечваў зброяй. Праз шмат гадоў пасля вайны яна прачытала пра гэта ва ўспамінах уратаваных Іванам Панковым чырвонаармейцаў. Некаторыя з іх падтрымлівалі сувязь з сям'ёй Панковых на працягу ўсяго жыцця.**

**Знайсці інфармацыю пра загінулых альбо прапаўшых без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны сваякоў і блізкіх, вызначыць месца іх пахавання можна з дапамогай наступных адкрытых крыніц, якія ўвесь час абнаўляюцца:**

**http://www.obd-memorial.ru** — абагульненны камп'ютарны банк даных, што ўтрымлівае інфармацыю аб абаронцах Айчыны, якія загінулі ці прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны (АБД Мемарыял)

**http://www.dokst.ru** — цэнтр дакументацыі аб'яднання Саксонскія мемарыялы ў памяць ахвяр палітычнага тэрору (базы даных савецкіх ваеннапалонных, пахаванняў савецкіх грамадзян на тэрыторыі Германіі)

**http://shmyrev.museum.by** — Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза Міная Філіпавіча Шмырова (спісы партызан, ваеннаслужачых, вязняў, звязаных з Віцебшчынай)

### «ЦЕЛЫ ТАМ ЛЯЖАЛІ Ў СЕМ СЛАЁЎ»

**Ларыса БРУЕВА, старшыня Камісіі па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Віцебскага абласнога савета ветэранаў:**

— Упершыню пра ўрочышча Пяскі мы даведаліся ў 1992 годзе ад Трапезнікавай Яўгеніі Анатольеўны, якая тады ўзначальвала ваенна-патрыятычны клуб «Разведчыкі воінскай славы» ў школе №2 горада Наваполацка. Яна расказала пра тое, што ва ўрочышчы Пяскі мясцовыя хлопчыкі гуляюць у футбол чалавечымі чарапамі. Мы паехалі паглядзець і вырашылі, што будзем праводзіць там Вахту памяці, каб паспрабаваць аднавіць імёны, падняць астанкі і пахаваць іх па-чалавечы.

Але нас апярэдзілі скаўты міжнароднай экспедыцыі, якія не сталі чакаць пачатку Вахты памяці і пачалі раскопкі тым жа летам. Яны знайшлі і перапахавалі 482 салдат. У абутку знайшлі некалькі салдацкіх медальёнаў. Відавочна, палонныя такім чынам хавалі медальёны ад канваіраў. Тады ўдалося прачытаць пяць прозвішчаў.

На наступны год мы правялі ў Спаскім гарадку абласны пошукавы лагер. Тое, што ўбачылі ў першы дзень, нас надзвычай уразіла. Па абодва бакі ад месца расстрэлу высіліся капаніры пасляваеннага ціра для стральбы з танкаў. Унізе знаходзілася стрэльбішча, дзе тут жа, па костках, былі пракладзены лініі сувязі. Было відаць, што з дальніх краёў капаніраў вывозілі перамешаны з астанкамі людзей пясок для будаўніцтва дарогі ў бліжэйшым дачным пасёлку. А на месцы вывезенага пяску валяліся раскіданыя чалавечыя рэбры, сківіцы, чарапы...

Мы сустрэліся з мужчынам, які ў пасляваенныя гады працаваў трактарыстам і вёў на гэтым месцы работы па ўсталяванні ціра. Ён расказаў, што калі трактары наткнуліся на астанкі людзей, то камандзіры загадалі работы... працягваць. Ваеннапалонныя тады лічыліся здраднікамі. Гэты чалавек паведаміў, што целы там ляжалі ў сем слаёў і ўсе яны былі ссунуты разам з пяском на два бакі ціра. Значыць, тое, што знайшлі скаўты паміж капанірамі, — толькі ніжнія слаі вялізнага пахавання, да якога не дабраліся трактары.

Нам не дазволілі правесці раскопкі на месцы капаніраў, папрасілі толькі вызначыць межы пахавання. Мы знайшлі яшчэ 4 салдацкія медальёны, а таксама муштук ад горна з надрапаным прозвішчам «Міцін» і аўтаручку з надпісам: «2.3.1940 ВС — В. Снімшчыкаў». Той жа восенню мы заклалі ва ўрочышчы парк з 200 дрэў, але праз год усе дрэвы былі ўкрадзены, як і крыж, усталяваны раней скаўтамі. У 2005 годзе капаніры разраўнялі.

Трэба не толькі ўсталяваць ва ўрочышчы мемарыял, але і аднавіць імёны пахаваных там людзей. Без раскопак гэта зрабіць немагчыма. Пачынаючы з 1992 года мы безвынікова спрабуем знайсці спісы вязняў Дулага-125 у Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Нямецкае аб'яднанне Саксонскія мемарыялы выслала нам спіс з 528 прозвішчамі вязняў гэтага лагера, але ўсе гэтыя людзі былі вывезены з Полацка і загінулі ў іншых мясцінах. На жаль, аб'яднанне Саксонскія мемарыялы не мае картатэкі тых, хто пахаваны ў Спаскім гарадку.

Прапануем гэтым летам зрабіць пробныя шурфы на невялікім участку, каб упэўніцца, наколькі магчыма аднавіць імёны. Трэба прасіць праз СМІ адгукнуцца тых, хто ссоўваў капаніры ў 2005 годзе, каб яны паказалі, дзе ляжаць салдаты.

**Рыгор СКВАРЦОЎ, каардынатар праекта тэлеканала «Звезда» (РФ) па пошуку ваеннапалонных вязняў нямецкіх лагераў 1941 — 1945 гг.:**

— Я быў адным з кіраўнікоў той самай міжнароднай экспедыцыі ў Полацку ў 1992 годзе, скаўты якой наткнуліся ва ўрочышчы Пяскі на ледзь прысыпаныя пяском астанкі савецкіх салдат. Усе, асабліва маладыя людзі з Францыі і ЗША, якія ніколі з падобным не сутыкаліся, перажылі моцнае душэўнае ўзрушэнне, і потым я ўвесь час імкнуўся вярнуцца на тое месца. У 2013 годзе гэта мне ўдалося. Тое, што ўбачыў, выклікала жах. Чалавечыя косткі па-ранейшаму можна знайсці на паверхні. Таму я палічыў сваім абавязкам дабіцца нейкіх вынікаў. Гэта — абавязак не толькі перад памерлымі, але і перад жывым яшчэ былым вязнем Дулага-125 Міхаілам Скрабіным, кавалерам ордэнаў Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны, якому ўдалося ўцячы з лагера і далучыцца да партызан, а потым з часткамі Чырвонай Арміі дайсці да Кёнігсберга...

Ствараючы на расійскім тэлеканале «Звезда» праект па пошуку ваеннапалонных нямецкіх лагераў, мы сутыкнуліся з тым, што гэтая тэма — амаль невядомая. Нам удалося знайсці сваякоў 15 загінулых вязняў полацкіх лагераў, якія з 1941 года нічога не ведалі пра лёс сваіх родных. Усе яны збіраюцца прыехаць на брацкую магілу ў Полацкі раён. Такая работа мае вялікі сэнс.

Таму я хачу падтрымаць сумесны з палачанамі праект газеты «Звязда» па зборы сродкаў для мемарыяла і аб'яднанні неабыякавых да гэтай тэмы людзей. Вельмі важна па выніках «круглага стала» ўсім яго ўдзельнікам дамовіцца аб узаемадзеянні.


Знойдзеныя ў 1993 годзе бланкі салдацкіх медальёнаў, капсулы да іх і асабістыя рэчы ваеннапалонных Дулага-125 захоўваюцца ў музеі 43-й школы горада Віцебска і ў музеі пошукавых атрадаў Віцебскай вобласці.

**Віктар ШУМСКІ, начальнік упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь:**

— Згодна з выдадзеным беларускімі архівістамі ў 2004 годзе даведніку «Лагеры савецкіх ваеннапалонных у Беларусі. 1941 — 1944», на тэрыторыі нашай краіны знаходзілася 257 месцаў прымусовага ўтрымання ваеннапалонных у 158 населеных пунктах. Па даных надзвычайных камісій, у 27 лагерах не было сведчанняў пра колькасць вязняў. І толькі ў 16 лагерах захавалася інфармацыя пра колькасць загінулых — 571 434 чалавекі. Агульная колькасць загінулых ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі — ад 1 млн — да 1 млн 200 тыс. чалавек.

У Мінску знаходзілася каля 22 лагераў, у абласных цэнтрах — 12-16, у некаторых раённых цэнтрах (якія з'яўляліся вузлавымі чыгуначнымі станцыямі) — ад 6 да 8 лагераў. Полацк тады быў абласным цэнтрам.

Ваеннаслужачыя 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны Беларусі працавалі ў Полацкім раёне і ў Полацку. У 2005 годзе ў 26 раскопах былі знойдзены астанкі 356 савецкіх ваеннапалонных, 9 медальёнаў, надпісы на якіх удалося прачытаць.

Праблема правядзення раскопак звязана з тым, што ў матэрыялах надзвычайных камісій, у тым ліку па Полацку, адсутнічае прывязка да мясцовасці: не пазначана дакладнае месцазнаходжанне ям з астанкамі, адлегласць паміж імі. Таму мы рэкамендуем устанаўліваць межы мемарыяльнай зоны так, каб у перспектыве была магчымасць іх змяніць.

**Наталля ГУЙВІК:**

— Тэрыторыя мемарыяла будзе, па сутнасці, уяўляць сабой зялёную зону, каб захаваць магчымасць правядзення пошукавых работ і перапахавання астанкаў.

**У Нацыянальным архіве Беларусі захоўваецца фактычна ўся дакументацыя акупацыйных улад. Вывучаючы яе, калі паставіць сабе мэту працаваць менавіта цэлай групай, можна дабіцца значных поспехаў па тэме, звязанай з полацкай трагедыяй.**

### НЕАБХОДНА СУМЕСНАЯ ГРУПА

**Аляксандр САМОВІЧ, дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь:**

— Тэма, якую мы сёння абмяркоўваем, прымушае глядзець углыб, вывучаць праблему дэталёва. Калі раней мы падлічвалі агульную колькасць ваеннапалонных, якія прайшлі праз лагеры, то сёння цікавімся, як склаўся іх лёс. Гэта вельмі працаёмкая задача.

Інфармацыю агульнага характару мы традыцыйна выдаём у сваіх зборніках. Там ёсць і інфармацыя пра Дулаг-125, сцісла апісана яго гісторыя, апублікаваны некаторыя дакументы.

Але не выключана, што на самой справе дакументаў, звязаных з гісторыяй гэтага лагера, можа знайсціся значна больш. Магчыма, будзе па-ранейшаму складана прасачыць лёс канкрэтнага чалавека, бо падчас ваенных гадоў, асабліва адступлення нямецкай арміі, наўмысна знішчаліся картатэкі. Аднак мы маглі б аднавіць гістарычны фон, зразумець псіхалогію працэсаў, якія тады адбываліся.

У нас захоўваецца фактычна ўся дакументацыя акупацыйных улад. Дакументы палітычных, праваахоўных органаў, медыцынскіх устаноў, чыгуначнага транспарту... Вывучаючы іх, калі паставіць сабе мэту працаваць менавіта цэлай групай, можна дабіцца значных поспехаў па тэме, звязанай з полацкай трагедыяй. Аднаму чалавеку гэта не пад сілу, бо наш спецыяліст, не падрыхтаваны ў галіне перакладу нямецкай ваеннай тэрміналогіі, часта многія важныя рэчы не можа зразумець. Нямецкія перакладчыкі тут могуць аказаць значную дапамогу. Таму я заклікаю да сумеснага архіўнага пошуку. Нацыянальны архіў Беларусі адкрыты для даследаванняў, справы рассакрэчаны. Мы можам ствараць сумесныя беларуска-нямецка-італьянскія рабочыя групы і працаваць.

**Хольгер РАПІЁР, намеснік Пасла Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь:**

— Факты, якія я пачуў, прымушаюць сучаснага чалавека затаіць дыханне ад жаху. На жаль, на тэрыторыі Беларусі такіх месцаў, як Пяскі, вельмі шмат — можна казаць пра сотні. І вы маеце рацыю: нельга дазволіць нікому забыць пра тое, што там адбывалася.

Я быў узрадаваны, калі пачуў, што ў гэтай сферы існуюць прыклады прадуктыўнага супрацоўніцтва з нямецкімі арганізацыямі. Быў згаданы горад-пабрацім Полацка Фрыдрыхсхафен. Мы ведаем, што Міністэрства абароны Беларусі вельмі цесна супрацоўнічае з Нямецкім народным саюзам па доглядзе ваенных магіл, каб увекавечыць памяць загінулых.



**Трэба не толькі ўсталяваць ва ўрочышчы мемарыял, але і аднавіць імёны пахаваных там людзей. Без раскопак гэта зрабіць немагчыма.**

Усе, хто выступаў да мяне, адзначалі, што сёння вельмі складана ўстанавіць канкрэтныя прозвішчы і нават дакладныя месцы, дзе адбываліся пэўныя падзеі. Колькасць імён, якія на сёння ўстаноўлены, у параўнанні з агульнай колькасцю загінулых, вельмі малая. Але гэта ні ў якім разе не павінна прымусіць нас апусціць рукі. Неабходна архівістам, вучоным і з нямецкага, і з беларускага бакоў пастарацца знайсці хоць штосьці.

Наколькі я ведаю, у стасунках паміж Германіяй і Расіяй існуе двухбаковая германа-расійская камісія гісторыкаў. Калі такой камісіі паміж Беларуссю і ФРГ не існуе, то гэта пытанне, якое можа быць вырашана на ўзроўні ўрадаў абедзвюх краін. Адзін з бакоў павінен выступіць з ініцыятывай стварыць такую камісію, якая будзе складацца з гісторыкаў, архівістаў і спецыялістаў з іншых сфер. У рамках гэтай камісіі магла б вырашыцца вельмі важная праблема, якая зараз перашкаджае такім даследаванням — гэта праблема моўнага бар'ера.

**Просім адгукнуцца тых, хто ў 2005 годзе ўдзельнічаў у работах па ліквідацыі ціра і капаніраў у Спаскім гарадку ў Полацку, на месцы масавага пахавання савецкіх ваеннапалонных. Неабходна інфармацыя, якая зможа аблегчыць пошукавыя работы.**

Магу вас запэўніць, што з боку нямецкага пасольства вы можаце разлічваць на гатоўнасць падтрымліваць усе ініцыятывы такога кшталту.

**«ЗВЯЗДА»:**

**— У гісторыі Дулага-125 ёсць асобная малавядомая старонка, звязаная з утрыманнем там італьянскіх ваеннапалонных. У Полацку, якраз па суседстве з урочышчам Пяскі, пражывае Уладзімір Бальшакоў, былы малалетні вязень Дулага-125, які памятае ў гэтым лагеры італьянцаў, што дзяліліся з ім вопраткай і ежай. Сведкі кажуць, што італьянцы ўтрымліваліся ў такіх жа ўмовах, як і савецкія ваеннапалонныя. Гэта значыць, верагоднасць таго, што нехта з італьянскіх салдат пахаваны ў Пясках, вельмі вялікая.**

**Наталля ГУЙВІК:**

— Дакументы Камітэта дзяржаўнай бяспекі БССР сведчаць, што італьянцы ўтрымліваліся ў 12 нямецкіх лагерах на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і ў Дулагу-125 у горадзе Полацку. Усяго ў гэтым лагеры знаходзілася 846 італьянскіх салдат. На жаль, нам вядомы ўстановачныя даныя толькі на пяць з іх, але мы нават не ведаем, ці вярнуліся яны дадому.

**Дамініка КАЛІКІА, загадчык Консульскім аддзелам Пасольства Італьянскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь:**

— Больш за 20 гадоў Італьянскае пасольства ў Беларусі рэалізуе праект пошуку і ідэнтыфікацыі загінулых суайчыннікаў. За апошнія гады былі знойдзены два новыя пахаванні італьянскіх ваеннапалонных. Абодва знаходзяцца ў Гомельскай вобласці. Вядома, што італьянскія салдаты пахаваны па ўсёй Беларусі. Мы зацікаўлены ў тым, каб знайсці і ідэнтыфікаваць усіх.

Тэлеканал АНТ здымае дакументальны фільм аб італьянскіх вязнях, і наша пасольства дапамагло куратару гэтага праекта Кацярыне Паршыкавай наладзіць сувязі з журналісткай-фрылансерам Стэфаніяй Аленай Карнемола, якая падрыхтавала шмат артыкулаў па гэтай тэме і якая можа аказаць значную дапамогу.

Хачу паўтарыць, што Італьянскае пасольства жадае супрацоўнічаць з беларускімі ўладамі ў справе ўсталявання помнікаў італьянскім вязням.

### ІНШЫЯ ШЛЯХІ ПОШУКУ

**Наталля ГУЙВІК:**

— Нам пакуль не ўдалося падключыць да актыўнага пошуку сваякоў ваеннапалонных Дулага-125 расійскія рэгіёны. І гэта пры тым, што большасць вязняў лагера былі ўраджэнцамі Расіі.

**Сяргей АФАНАСЬЕЎ, старшы памочнік ваеннага аташэ пры Пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь:**

— На жаль, некаторыя рэгіянальныя чыноўнікі больш думаюць пра імгненны вынік, таму неахвотна падключаюцца да пошуку дакументаў альбо сваякоў загінулых. Але, думаю, разам мы павінны змагацца за нашу агульную памяць. Што датычыцца апарату ваеннага аташэ пры Пасольстве Расійскай Федэрацыі, безумоўна, праз упраўленне Міністэрства абароны па ўвекавечанні памяці загінулых пры абароне Айчыны мы будзем аказваць магчымае садзейнічанне.

Апошнім часам гэтае ўпраўленне актывізавала ваенна-мемарыяльную работу за межамі краіны. Мы супрацоўнічаем з беларускімі калегамі па абмене пашпартамі воінскіх пахаванняў. Інтарэс у Расіі да таго, дзе загінулі дзяды і бацькі ў гады той вайны, расце. Літаральна ў другой палове красавіка ў нас была дэлегацыя Міністэрства абароны РФ, у складзе якой знаходзіўся афіцэр, які прывёз пахаванку на дзеда, што загінуў на тэрыторыі Беларусі. Дзякуючы беларускім калегам мы знайшлі месца пахавання, і ён змог наведаць родную магілу.

**Ларыса БРУЕВА:**

— У Расіі вельмі шмат пошукавых атрадаў. І калі мы знаходзім прозвішча салдата, то звяртаемся часцей не ў ваенкамат і мясцовыя органы ўлады, а да пошукавікаў, і яны хутка выходзяць на сем'і загінулых. Яшчэ адзін шлях — пошук праз сайт «Аднакласнікі».

**Ірына ШЫШКОВА, старшыня аргкамітэта па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў пры Віцебскім аблвыканкаме:**

— Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза Міная Філіпавіча Шмырова з'яўляецца рэгіянальным цэнтрам па пошуку і ўвекавечанні загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны. На яго базе ствараецца абласны аўтаматызаваны банк даных, які часткова ўжо размешчаны на сайце музея. У гэтай базе знаходзіцца каля 150 тысяч звераных прозвішчаў савецкіх воінаў з 400 тысяч пахаваных на Віцебшчыне. З іх толькі 2 тысячы 760 — ваеннапалонныя.

Безумоўна, мемарыял «Урочышча Пяскі» павінен быць. Летась Віцебскай вобласцю з бюджэту было засвоена 4,2 млрд рублёў на ўвекавечанне абаронцаў Айчыны, сёлета выдзелена 9,5 млрд, у тым ліку Полацку — 1 млрд. Пры фарміраванні бюджэту Полацк быў разгледжаны ў асаблівым рэжыме менавіта ў сувязі з неабходнасцю будаўніцтва мемарыяла ў Пясках.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Надзея ЮШКЕВІЧ.**

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

***P.S. Усе прапановы, агучаныя на пасяджэнні «круглага стала», вырашылі аформіць у выніковы дакумент, які кожны яго ўдзельнік паабяцаў разглядаць як кіраўніцтва да далейшых дзеянняў. Па сутнасці, абмеркаванне ў «Звяздзе» тэмы ўвекавечання памяці ваеннапалонных — толькі пачатак вялікай работы. Сумесны праект Полаччыны і газеты працягваецца.***

**Грошы на стварэнне мемарыяла «Урочышча Пяскі» можна пералічваць у Віцебскае абласное аддзяленне ГА «Беларускі фонд міру» на рахунак**

***№ 3135411066036 (у беларускіх рублях),***

***№ 3135411066502 (у доларах),***

***№ 3135411066805 (у расійскіх рублях)***

у дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк» па Віцебскай вобласці, код 153001739, УНП 300126736

## ЧАЦВЕР, 15 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «Дыверсант». Заключныя серыі.**
**11.05, 20.00 Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера-2».**
**12.10, 1.50** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.00 Серыял «Сіндром Дракона». Заключныя серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «След».**
**16.30** Сямейныя меладрамы.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.40** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Дыверсант. Канец вайны». 1-я і 2-я серыі.**
**23.50** Вечар цяжкага дня.
**1.10** Чэмпіянат свету па хакеі-2014. Агляд гульнявога дня.
**1.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 20.35** Тэлебарометр.
**9.05, 15.35 Дэтэктыў «Прыгоды натарыуса Неглінцава».**
**10.15** Заўтра — гэта мы!
**10.50, 0.00 Серыял «Лялькі ведзьмака». Заключная серыя.**
**11.55, 19.05 Серыял «Метад Фрэйда».**
**14.05** Аўтабатл.
**14.40** Футбол. На шляху да чэмпіянату свету па футболе-2014. Відэачасопіс.
**15.10** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**16.40** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада — Данія.
**20.40** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінляндыя — Беларусь. У перапынку: **21.15** КЕНО.
**23.00 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**0.50** Музычны конкурс «GBOB» у Беларусі.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.15, 15.00, 17.00, 21.05, 0.15** «Калейдаскоп».
**8.10, 12.25, 15.10, 17.10, 0.25** «Сімвалы эпохі». Казакі.
**8.20, 19.55 «Сышчык Пуцілін». Маст. фільм.**
**9.15, 22.05** «Сімвал Перамогі». Германія. Воін-вызваліцель.
**9.40, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**10.30, 23.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанкі.
**10.55, 13.45, 19.10** «Размаўляем па-беларуску».
**11.00 «Атрад асобага прызначэння». Маст. фільм.**
**12.35** «Цуды прыроды». Коста-Рыка. Кенія.
**13.05 «Фабрыка цудаў». Дак. фільм. Фільм 1-ы.**
**13.30** «Палескі пачастунак». Грыбны квас і клёцкі.
**13.50** М/ф.
**14.10** «Без эпітафіі». Дак. фільм.
**15.20 «Бусляня». Маст. фільм.**
**16.05** «На прыродзе з Віталем Гуменным». Балота Дзікае.
**16.15** «Карані». Справы сямейныя. Беларускія сем'і, якія пражываюць у Польшчы.
**16.45** «Музеум». Скульптурныя надмагіллі.
**17.20** «Камертон». Расійскі джазавы, класічны і эстрадны саксафаніст Георгій Гаранян.
**17.50** «Тэатральны ліцэй». Сапластнікі.
**18.15** «Андрэй Грамыка. Гігант, якому ўдалося выжыць». Дак. фільм.
**19.15** «Таямніца помніка». Дак. фільм.
**20.45** Калыханка.
**22.35 «Трэцяя ракета». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.20, 15.40** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Агляд гульнявога дня.
**8.20** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Расія — Казахстан.
**10.10** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Фінал. «Севілья» (Іспанія) — «Бенфіка» (Партугалія).
**12.00** Тэніс. Турнір ВТА. Рым.
**13.50** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Славакія — Нарвегія.
**16.40** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. ЗША — Латвія.
**19.00** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. БАТЭ — «Дынама» (Мінск).
**20.45** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Швецыя — Францыя.
**23.15** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Фінляндыя — Беларусь.

### АНТ

**6.00, 8.30, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Справа ваша...».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Деффчонки».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Другое дыханне».**
**23.10 Фэнтэзі «Вайна багоў: Бессмяротныя».**
**1.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 10.40, 13.50, 18.30, 23.00** Дзённік «Дзеці — гэта «ХороШоу».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Дакументальны спецпраект»: «Бітва закінутых светаў».
**10.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.45, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «У нас усе дома». Серыял.**
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Прыгоды дылетанта».
**13.55 Меладрама «Спатканне на адну ноч».**
**15.45** «Не хлусі мне!».
**16.50** «Следакі».
**17.20** «Міншчына».
**18.35** «Мае цудоўныя...».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15, 20.40 Маст. фільм «Карабель-прывід».**
**20.30** «Гарачы лёд».
**22.10** «Глядзець усім!».
**23.05** «Тайны свету».
**0.00** «Аўтапанарама».
**0.20 «Знахар». Серыял.**

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**8.10 Серыял «Імперыя пад ударам».**
**10.00 Маст. фільм «Даурыя».**
**11.35** «Дыяспары».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**15.20, 23.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10 Серыял «Лепшы горад Зямлі».**
**18.20 Серыял «Лігаўка».**
**21.20 Серыял «Дзяўчаты і бомбы».**
**23.00** «Злачынства і пакаранне».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.55** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.15** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Смак перамогі. Вертыкаль Сяргея Паўлава».
**15.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.45 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял «Сястра мая, Любоў».**
**0.25** «Жывы гук».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Справа густу».
**15.40, 18.35, 23.05** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «ППС-2».**
**21.20 Серыял «Дазнаўца-2».**
**23.30 Серыял «НС — надзвычайная сітуацыя».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.35, 19.00, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** «Мультпарад».
**7.30 Драма «Шлях дадому».**
**9.50, 17.55 Серыял «Смерць у раі».**
**10.50** «Неверагодная магія».
**11.00, 19.05 Серыял «Добрая жонка».**
**12.40** «Кінаблакнот».
**13.00** «Тэлемагазін».
**13.30 Серыял «У чым віна Фатмагуль».**
**15.10 Серыял «Да смерці прыгожая».**
**16.30** «VR-дайджэст».
**17.00 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Меладрама «Блізкасць».**
**23.20** Ток-шоу «Бульбокс».

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00 Серыял «Нефармат».**
**10.00** «Давай апранемся».
**11.00** «Праправанс».
**11.30** «Я люблю зорку».
**12.00, 20.00 Серыял «Апошні з Магікян».**
**13.00, 23.10** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Нанакаханне».**
**16.00 Камедыя «Мытня дае дабро».**
**18.40, 0.00** «Лаві момант».
**21.10 Фэнтэзі «Час ведзьмаў».**

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 23.40** «Назіральнік».
**10.15 «Пэры Мэйсан». Серыял.**
**11.10, 1.50** «Ціха Браге». Дак. фільм.
**11.20, 19.10** «Правілы жыцця».
**11.45** «Расія, любоў мая!»
**12.15, 0.55** «Хрыстафор Калумб у пошуках новага свету». Дак. фільм.
**13.05, 22.50 «Сава Марозаў». Маст. фільм.**
**14.10** «Бязважкае жыццё». Дак. серыял.
**14.40** «Абсалютны слых».
**15.20** «Майстар Андрэй Эшпай». Дак. фільм.
**16.05** 5 гадоў Маскоўскаму міжнароднаму фестывалю Мсціслава Растраповіча. Сімфанічны аркестр Баварскага радыё.
**17.00** «Каміль Пісаро». Дак. фільм.
**17.10** Academia.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**19.40** «Матылёк. Люсьена Аўчыннікава». Дак. фільм.
**20.20** Культурная рэвалюцыя.
**21.05** Прыступкі цывілізацыі. «Дагістарычныя зорныя часы». Дак. фільм.
**22.00** «Аўтар тэатра». Чатыры вечары з Львом Додзіным.
**0.35** Э. Грыг. Сюіта для аркестра з музыкі да драмы Ібсена «Пер Гюнт».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Яловая субмарына». 2005 год.
**5.50** Фільм-канцэрт «Бенефіс Веры Васільевай». 1974 год.
**6.45, 0.50** Маст. фільм «Да Месяца рукой падаць».
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 16.00** «Аўтарскі вечар кампазітара Мікіты Багаслоўскага». 1994 год.
**11.00** Дак. фільм «Дзеці XX з'езда».
**12.00** «Служэнне муз не трывае мітусні. Васіль Ліванаў учора і сёння». 1992 год.
**12.35** М/ф «Хлопчык і дзяўчынка».
**12.45, 18.45 Маст.фільм «Цэмент».**
**17.00** Дак. фільм «Пошук рукі: год 2000».
**17.40, 4.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**18.00**»... Да 16 і старэйшым». З удзелам Бенні Хіла. 1992 год.
**22.00** Праграма «Погляд». 1995 год.
**23.00** «АБВГДэйка». 1981 год.
**0.00** «Гэта вы можаце». 1992 год.
**4.00** «Няма праблем?!». 1991 год.

### EUROSPORT

**9.30, 14.30, 23.00** Веласпорт. Тур Італіі.
**10.45, 13.45, 0.00** Веласпорт.
**11.45, 18.45, 20.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17).
**18.30** Тэніс. Рыхтуемся да «Ралан Гарос».
**21.45** Баявыя майстэрствы. Суперкамбат.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 2.20** Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
**5.55, 13.50, 16.45, 23.50, 3.05** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Камедыя «Ёлкі 2».
**8.45** Меладрама «Рэальнае каханне».
**11.15** Камедыя «Блізнюк».
**14.10** Камедыя «Святоша».
**16.20** Камедыя «Банк».
**17.20** Прыгоды «Аперацыя Дэльта Фарс».
**19.20** Меладрама «Дзеля кахання да Мэры».
**21.00** Серыял «Доўга і шчасліва». 1-2 серыя.
**21.45** Камедыя «Лячэнне».
**22.10** Камедыя «Усе выраслі».
**0.10** Камедыя «Скажы так».
**3.25** Камедыя «Ёлкі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.40, 14.40, 2.45** «Доктар І.».
**9.10, 18.30, 3.10** «Забароненае каханне». Серыял.
**10.45, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.45, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.15, 20.10** «Шапавалаў». Серыял.
**14.10, 22.05** «Гісторыі выратавання».
**15.10, 0.30, 5.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**21.10, 4.30** «Жыццё і лёс». Серыял.
**22.40** «Ціхі амерыканец». Маст. фільм.
**1.15** «Хадзячыя мерцвякі». Серыял.
**2.00** «Дом уверх дном».

### ТБ1000

**4.40** Меладрама «Міс Пецігру».
**6.20** Дэтэктыў «Перакладчыца».
**8.40** Драма «Імператарскі клуб».
**10.40** Трылер «Наркоз».
**12.20** Драма «Лэдзі».
**14.40** Драма «Паляванне».
**16.50, 23.05** Драма «Сёстры Магдаліны».
**19.00** Меладрама «Прыкінься маім мужам».
**20.50** Драма «Олівер Твіст».
**1.10** Драма «8 міля».
**3.10** Меладрама «Ідэальны мужчына».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**7.00** Дэтэктыў «Лёс рэзідэнта».
**8.30** Меладрама «Восеньскія клопаты».
**10.20** Драма «Мора».
**12.00** Драма «Якія сышлі з нябёсаў».
**13.30** Драма «Мелодыя для катрынкі».
**16.10** Камедыя «2 дні».
**18.00** Фантастыка «Туман 2».
**20.00** Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
**21.45** Камедыя «Пра што яшчэ гавораць мужчыны».
**23.30** Маст. фільм «Паляванне на Вервольфа».
**1.40** Камедыя «Ноч зачыненых дзвярэй».
**3.30** Драма «Падпаручнік Рамашоў».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00** У пошуках марскога супердрапежніка.
**7.00, 16.00** Паляванне на паляўнічага.
**8.00, 11.00, 13.00** Скарбашукальнікі.
**9.00, 14.00** Дзікая будоўля.
**10.00, 18.00** Золата Юкана.
**12.00, 19.00** Гульні розуму.
**12.30, 19.30** Займальная навука.
**17.00, 2.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**20.00, 0.00, 3.00** Прыроджаны байкер.
**22.00** Ліхтугі за мяжой.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

**7.00** Мотарэстаўрацыя.
**7.50** Рыбацкія легенды Якуба Вагнера.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Паляўнічыя на склады.
**10.30** Top Gear.
**11.25** Пяцёрка лепшых.
**12.20, 0.55** Эверэст: за мяжой магчымага.
**13.15, 16.00, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Класіка з Паўднёвага пляжа.
**15.05** Хлопцы з Юкана.
**17.20, 3.05** Ліквідатар.
**18.15** Паляўнічыя на рэліквіі — ламбард.
**19.10** Гульні ў ламбардзе.
**21.00** Залатая ліхаманка.
**23.00** Золата льдоў.
**0.00, 5.10** Пераломны момант.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## ПЯТНІЦА, 16 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».**
**11.05, 19.55 Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера-2».**
**12.10, 0.10 Серыял «Містычныя гісторыі».**
**13.05 Меладрама «Другое дыханне».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «След».**
**16.20** «Сямейныя меладрамы».
**17.15** «Мая праўда». «На-На: Куміры з падваротні».
**18.10** Тайны следства.
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55 Фантастыка «Людзі ў чорным».**
**23.55** Дзень спорту.
**0.55** Чэмпіянат свету па хакеі-2014. Агляд гульнявога дня.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 19.00** Тэлебарометр.
**9.05, 15.35 Дэтэктыў «Прыгоды натарыуса Неглінцава».**
**10.20** Стыль-бюро.
**11.00** «Два з паловай кухары».
**11.50 Серыял «Метад Фрэйда».**
**13.00 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**14.05** «Імперыя песні».
**15.10** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**16.40** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада — Італія.
**19.05** «Кіпень».
**19.25** Экстрасэнсы вядуць расследаванне.
**20.40** Хакей. Чэмпіянат свету. Швецыя — Славакія. У перапынку: **21.15** КЕНО.
**23.00** Рэпарцёр.
**23.45 Камедыя «Прадзюсары».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.20, 14.55, 17.00, 21.05, 0.55** «Калейдаскоп».
**8.10, 12.30, 15.05, 17.05, 1.00** «Сімвалы эпохі». Балалайка.
**8.20 «Сышчык Пуцілін». Маст. фільм.**
**9.15, 22.00** «Лёс гігантаў». «Трабант». Дак. фільм.
**9.40, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**10.35, 0.25** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака-графіка Анатоля Тычыны.
**11.00, 14.10, 16.10, 18.30** «Размаўляем па-беларуску».
**11.05 «Трэцяя ракета». Маст. фільм.**
**12.45** «Шастаковіч буйным планам. Партрэт». Дак. фільм.
**13.45** «Наша спадчына». Фрэскавыя росписы Мсціслава.
**14.15 «Паром». Маст. фільм.**
**15.15** «Камертон». Літоўскі тэнар, оперны спявак Віргіліус Нарэйка.
**15.45** «Цуды прыроды». Мадэйра. Тайвань. Балі.
**16.15** М/ф.
**16.30** «Тэатральны ліцэй». Галінкі і карані.
**17.20** «Падарожжа са смакам». Германія.
**17.50** «Фабрыка цудаў». Дак. фільм.
**18.20** «Адвечным шляхам». Дак. фільм.
**18.35** «Пейзажы скрозь час». Пейзажы Джона Фрэдэрыка Кэнсэта на Востраве задавальнення.
**19.05** «Скарбніца Міншчыны». Драўляныя храмы.
**19.30 «Выстрал». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**22.30** «Я люблю тебя, жизнь!». Творчы вечар акцёра тэатра і кіно, спевака і кампазітара Анатоля Длузскага.
**0.00** «АРТіШОК». Фатограф Даніїл Парнюк.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.50, 15.40** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Агляд гульнявога дня.
**8.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. БАТЭ — «Дынама» (Мінск).
**10.35** «На шляху да чэмпіянату свету па футболе-2014». Відэачасопіс.
**11.05** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Фінляндыя — Беларусь.
**13.00** Тэніс. Турнір ВТА. Рым. 1/4 фіналу.
**15.05** Фактар сілы.
**16.40** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. ЗША — Казахстан.
**19.15** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Агляд двух згуляных матчаў.
**19.55** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Прэв'ю.
**20.40** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Фінляндыя — Швейцарыя.
**23.15** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Швецыя — Славакія.
**1.05** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Справа ваша...».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Адваротны адлік». «Гандбол Міронавіча».
**15.30** «Вучыцца жыць».
**16.15 Маст. фільм «Мой любімы клоўн».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Вячэрні Мінск».
**22.20** «Што? Дзе? Калі? у Беларусі».
**23.40 Баявік «Некіруемы».**
**1.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 10.40, 13.50, 18.30, 23.00** Дзённік «Дзеці — гэта «ХороШоу».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** СТБ-спорт.
**9.00** «Гарачы лёд».
**9.10** «Дакументальны спецпраект»: «Бітва славянскіх багоў».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.45, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 «У нас усе дома». Серыял.**
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.55 Маст. фільм «Карабель-прывід».**
**15.35** «Не хлусі мне!».
**16.50** «Следакі».
**17.20** «Міншчына».
**18.35** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** 1/8 фіналу Цэнтральнай Міжнароднай лігі КВЗ.
**22.00, 23.05** «На тым жа месцы ў той жа час».
**23.55** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**0.40 Маст. фільм «Лэдзі Гамільтан».**

### МІР

**9.50 Маст. фільм «Два капітаны».**
**11.30, 4.25** «Сардэчна запрашаем».
**12.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**15.20** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**16.10 Серыял «Лепшы горад Зямлі».**
**18.20** Дак. фільм «Востраў Нешанцавання. 23 гады адзіноты».
**17.45 Маст. фільм «Кіроўца для Веры».**
**20.45 Маст. фільм «Варачка».**
**22.25 Серыял «Варачка 2. Выпрабаванне кахання».**
**1.45** Скетч-шоу «МасГарСмех».
**2.35** «Прыгоды Македонскай».
**2.50 Маст. фільм «Даурыя».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.55** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Анатомія кахання. Эва, Пола і Беата».
**15.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**16.35** «Уся Расія».
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.45 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**21.00 Серыял «Сястра мая, Любоў».**
**22.45** «Паядынак».
**0.45 Маст. фільм «Знарок не прыдумаеш».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «ППС-2».**
**22.05 Баявік «Антыкілер ДК».**
**23.40 Серыял «НС — надзвычайная сітуацыя».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.35, 19.00, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30 Драма «Аперацыя «Валькірыя».**
**9.25, 17.55 Серыял «Смерць у раі».**
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
